У МАІ ПАВЫСІЦЦА БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ 3

«ЧАС ЖЫЦЦЯ»: ПРАЖЫЦЬ ТАК, КАБ НЕ ШКАДАВАЦЬ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 КРАСАВІКА 2022 г. СУБОТА № 84 (29706)

КАРАТКА

• Будаўніцтва новага музея ў «Хатыні» пачнецца адразу пасля 9 Мая.

• **З пачатку года ў «Кнігу памяці Беларусі» ўнесены звесткі пра 2,4 тысячы загінулых у гады войнаў.**

• Камп'ютарныя тамографы паставяць у тры раённыя бальніцы Брэсцкай вобласці: Ляхавіцкую, Камянецкую і Драгічынскую.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Сёння актуальная тэма — цэны. Сітуацыя на знешніх рынках да гэтага часу нестабільная, і цэны ў свеце штарміць. Гэта ўплывае і на Беларусь. У сакавіку былі і ваганні курсаў валют. Тады многія пастаўшчыкі харчовых і нехарчовых тавараў узнялі цэны. Мы запрасілі іх да сябе, правялі шэраг гутарак, у больш за 70 кампаній запыталі іх дакументы па фарміраванні цэн. Па выніках нашага маніторынгу і аналізу бачым, што ўжо ў гэтым месяцы, калі параўноўваць з мінулым, напрыклад, на такія тавары, як найбольш папулярныя віды масел для аўтамабіляў, цэны знізіліся на 55 %, на шыны — на 19 %, на фільтры — на 50 %. Такі ж аналіз мы правялі і па складанай бытавой тэхніцы. У выніку нашай работы цэны на тэлевізары знізіліся на 20 %, на халадзільнікі — на 19 %. Іншыя тавары мы таксама працягваем маніторыць, каб такіх завышэнняў не было».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У вас можна жыць і працаваць. Мы будзем рабіць усё, каб вам у гэтым дапамагчы»

Прэзідэнт пабываў у пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС Чачэрску і паабяцаў працягваць дзяржаўную падтрымку чарнобыльскіх раёнаў

Рэгіёны Беларусі, якія былі забруджаны пасля выбуху на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, Аляксандр Лукашэнка наведвае штогод у дзень аварыі 26 красавіка. Гэтым разам свой візіт ён адклаў на некалькі дзён з-за ўмоў надвор'я, бо плануе не толькі сустрэцца з жыхарамі, але і на ўласныя вочы ўбачыць, як вяртаецца да жыцця сельская гаспадарка раёна. Для камандзіроўкі Прэзідэнт абраў невялікі горад Чачэрск, што за гадзіну язды на поўнач ад Гомеля. Тут ён наведаў кукурузнае поле і малочна-таварную ферму ААТ «Отар», бальніцу, сустрэўся з мясцовымі жыхарамі. Чаму Прэзідэнт адмовіўся называць іх чарнобыльцамі і як мясцовым жыхарам удалося «надаваць па мардасах Чарнобылю» — у рэпартажы з Чачэрска карэспандэнта «Звязды».

Фота БелТА

ПРА ЗДАРОЎЕ І ЎРАДЖАЙ

Першае пытанне Прэзідэнта пасля прыбыцця на поле адрасавана аграрыям: што з пасяўной? Трымаў справаздачу міністр сельскай гаспадаркі Ігар Брыло. Яравая сяўба па краіне выканана на 40 працэнтаў, раннія яравыя пасеяны на 88 працэнтаў. Чатыры вобласці скончылі сяўбу, сярод тых, што адстаюць, — Віцебшчына і Магілёўшчына. Уся краіна перайшла да сяўбы кукурузы. Яе за 17—22 дні плануецца высеяць поўнасцю. Прэзідэнт папрасіў паспяшацца і паспець да 20 мая.

СТАР. 2

ЧАЛАВЕК-ПРАЦАЎНІК — АПОРА ДЗЯРЖАВЫ

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас са Святам працы.

На беларускай зямлі ва ўсе часы вялікай пашанай і павагай карыстаўся чалавек-працаўнік. Ён і сёння з'яўляецца найвялікшай каштоўнасцю і апорай нашай дзяржавы.

Першамай — цудоўная традыцыя, заслужаная даніна ўдзячнасці сапраўдным прафесіяналам, працоўным калектывам і ветэранам, усім, хто ўмее сумленна працаваць, ад чыіх намаганняў, ведаў, вопыту і высокіх вынікаў залежыць працвітанне Беларусі і дабрабыт яе народа.

Дзякую кожнаму, хто сваёй штодзённай працай стварае нашу агульную будучыню, якія б задачы і выклікі ні ставіў перад намі час.

У гэты святочны вясенні дзень жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, новых працоўных здзяйсненняў і мірнага неба над галавой.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Педсавет

АД «ЗАРНІЧКІ» ДА «АРЛЯНЯЦІ»...

Як на прыкладах асабістай мужнасці і гонару выхоўваецца новае пакаленне

«Год гістарычнай памяці ўвайшоў у жыццё нашай гімназіі вельмі арганічна, бо грамадзянска-патрыятычнай работай мы займаемся штодня шмат гадоў запар, літаральна з першых дзён адкрыцця нашай установы адукацыі», — кажа дырэктар сталічнай гімназіі № 43 Марыя КАВАЛЕЎСКАЯ.

УНІКАЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

— У 2010 годзе сярэдняя школа № 2 стала першай установай агульнай сярэдняй адукацыі ў сталічным мікрараёне-новабудоўлі «Каменная Горка», і нашай задачай было заняць дзяцей зусім новага мікрараёна чымсьці насамрэч важным і карысным, аб'яднаць іх агульнымі інтарэсамі. Праз пяць гадоў мы атрымалі статус гімназіі (адзінаццатыя ў Фрунзенскім раёне і апошнія — у Мінску). Сёння ў нас навучаюцца 1852 дзіцяці, гэта шмат, нагрузка сур'ёзная, — канстатуе Марыя Кавалеўская. — Прыярытэтным напрамкам работы мы абралі грамадзянска-патрыятычнае выхаванне. Ужо ў верасні 2010 года ў нас была створана піянерская дружына, арганізаваны піянерскія атрады. Дарэчы, у кабінеце грамадскіх арганізацый сёння сабрана цікавая экспазіцыя «Піянерыя — у маёй сям'і». Усе экспанаты сюды перадалі сем'і нашых навучэнцаў. Бацькі ахвотна адгукнуліся на нашу прапанову і падзяліліся савецкай школьнай формай, сваімі школьнымі дзённікамі, піянерскай атрыбутыкай...

У снежні 2012 года на базе гімназіі адкрыўся Міжшкольны цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі моладзі Фрунзенскага раёна. Яго ўзначальвае **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Аляксандр ІВАНОЎ.**

— Акрамя нашых старшакласнікаў, навучанне ў цэнтры па прадметах «Дапрызыўная падрыхтоўка» і «Медыцынская падрыхтоўка» праходзяць яшчэ 819 навучэнцаў з 17 устаноў адукацыі Фрунзенскага раёна, — расказвае Аляксандр Валер'евіч. — Заняткі ў цэнтры праводзяцца ў групах: асобна для хлопцаў і дзяўчат. Пасля заканчэння дзясятага класа хлопцаў чакаюць палявыя зборы.

У Музеі «Аб подзвігу вялікім і вечным».

СТАР. 7

«У вас можна жыць і працаваць. Мы будзем рабіць усё, каб вам у гэтым дапамагчы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праблемы ёсць з грэчкай: недахоп насення ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Яго плануюць закупіць у Расіі, сваіх запасаў для пасеву не хапае. «Нам трэба глядзець тут таксама на імпартазамяшчэнне. Спрабаваць насенне ствараць самім», — заўважыў Прэзідэнт.

Палівам аграрыі забяспечаны. З-за лішку яго ў Расіі яно будзе даступна і для беларускіх вытворцаў.

Наступнае пытанне — рамонт энерганасычаных трактароў. Па словах міністра, тэхнічная забяспечанасць па розных рэгіёнах — 93—97 працэнтаў. Але разам з усімі недахопамі ён сцвярджаў: краіна гатова ў аптымальныя тэрміны правесці ўсю пасяўную кампанію. «Мы зараз глядзім трактары, якія ішлі па старым лізінгу. Думаю, з усім шлейфам незапатрабаванай тэхнікі трэба развітвацца і актуалізаваць работу на той тэхніцы, якую можна падрамантаваць», — сказаў Ігар Брыло. У краіне ўжо створана 65 цэнтраў па рамонце сельгастэхнікі. Іх Прэзідэнт даручыў захаваць назаўжды як добрую практыку і падтрымку сялянам.

Запытаў Прэзідэнт, як справы ў Віцебскай вобласці: «Яны варушыцца пачынаюць там? Разумеюць, што гэты год вырашальны для іх?»

Асобнае даручэнне Прэзідэнта Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцям — забяспечыць кармамі жывёлу. «Кармы і яшчэ раз кармы. Вяртаемся да практыкі, калі ўводзілі намеснікаў дырэктараў па кормавытворчасці. Праблема была і нікуды не знікла. Трэба кіраўнікам займацца кармамі», — заўважыў Прэзідэнт.

Ігар Брыло далажыў і пра эксперт харчавання. Па выніках трох месяцаў прадалі на 1,8 мільярда, што ўжо рост больш чым на 20 працэнтаў. Дадалі ў продажы мяса (на 8,9 тысячы тон) і малочных прадуктаў (на 30 тысяч тон). Ды і цэны на сусветным рынку падраслі.

Адно з самых важных пытанняў — меліярацыя, вызваленне ад драўняна-хмызняковай расліннасці земляў. Тут даручэнне ад кіраўніка краіны віцэ-прэм'еру Леаніду Зайцу: «Разбярыся, гэта дзяржаўнае пытанне. Мы тут продажы, харчаванне, трактары абмяркоўваем. Гэта не наша справа. Наша справа дзяржаўная: дарогі, меліярацыя, урадлівасць земляў. Гэта наша пытанне. Мы на гэта павінны грошы накіроўваць перш за ўсё».

Прэзідэнт акцэнтаваў, што гэтыя землі неабходна выратаваць зараз — кожны год па 200 тысяч гектараў меліяраваць, адшукваючы на гэта сродкі з розных крыніц. «Гэта для мяне найважнейшае пытанне. Трэба прывесці ўжо краіну ў нармальны выгляд, каб поле было полем. За каналамі не глядзелі, меліярацыйныя сістэмы, дамбы, трубы, нават не абкошвалі каналы», — пералічыў праблемы Аляксандр Лукашэнка.

Малочна-таварная ферма «Отар», якую наведаў пасля поля Прэзідэнт, вырабляе малако сорту «экстра». Летась нарыхтавалі яго ў 8,5 тысячы тон, а ўдой на адну карову склаў 7745 кілаграм. Цяпер на ферме трымаюць больш за 4400 кароў. Прэзідэнт цікавіўся забеспячэннем іх кармамі, рацыёнам жывёл і назваў такія комплексы аптымальным варыянтам будаўніцтва фермаў.

«Калі ў цябе такі парадак кожны дзень — гэта добра», — сказаў кіраўнік краіны Таццяне Струк, дырэктару ААТ «Отар». Ён пацікавіўся заробкамі ў гаспадарцы. Як расказала дырэктар, сярэдні складае 1737 рублёў.

Наступны пункт маршруту Прэзідэнта — Чачэрская цэнтральная раённая бальніца. Укамплектаванасць медыцынскімі кадрамі там амаль 100 %, ды і забеспячэнне сучасным абсталяваннем не падвяло. У студзені адкрыты кабінет камп'ютарнай тамаграфіі, працуе кабінет гемадыялізу. З красавіка запускаецца пілотны праект па скрынінгу раку лёгкіх з камп'ютарнай тамаграфіяй органаў грудной клеткі. Пра сітуацыю з аховай здароўя ў рэгіёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, расказаў профільны міністр Дзмітрый Піневіч. Па яго словах, стан здароўя насельніцтва чарнобыльскіх рэгіёнаў і ўвогуле Гомельскай вобласці не адрозніваецца ад агульнарэспубліканскіх паказчыкаў.

«Якую выснову робім? Праграмы вырашаюць праблемы. Мы забяспечылі ахову насельніцтва ўсімі магчымымі сродкамі. Другі момант — медыцына ў пацярпелых рэгіёнах — гэта кадры, аснашчэнне, тэхналогіі, мабільная медыцына», — падкрэсліў міністр.

Прэзідэнт дадаў: «Зразумела, больш увагі ўдзяляем. Прыярытэт. Тэхніка, ды і кадры. Зразумела, калі ўвагі больш — адпаведны стан здароўя людзей».

Пасля даклада Аляксандр Лукашэнка наведаў кабінет правядзення рэнтгендаследаванняў, міжраённы кабінет КТ, міжраённае аддзяленне гемадыялізу, аперацыйную малаінвазійнай хірургіі, педыятрычнае аддзяленне.

АСАБЛІВЫЯ ЛЮДЗІ ПРЭЗІДЭНТА

Традыцыйна паездкі Прэзідэнта ў пацярпелыя рэгіёны не абыходзяцца без сустрэчы з мясцовымі жыхарамі. Так было і гэтым разам. Але спачатку Аляксандр Лукашэнка ўсклаў кветкі да помніка адселеным вёскам, устаноўленага пры выездзе з горада.

Кіраўнік краіны заўважыў, што пасля 36 гадоў з моманту трагедыі можна ўжо параўноўваць, чаго дасягнулі за гэты перыяд чарнобыльскія рэгіёны. Асабліва парадаваўся, падзяліўся ён, пазітыўнай ацэнцы здароўя мясцовых жыхароў ад профільнага міністра.

«Мы ж пастаянна абследуем людзей больш у Чачэрску, Ветцы, Брагіне, Хойніках і Нароўлі, чым у іншых раёнах. Больш сочым у Гомельскай, Магілёўскіх абласцях за людзьмі. Праз шмат гадоў пачынаем паказчыкі параўноўваць: што было і што ёсць. У нас вельмі добрая дынаміка па змяншэнні захваральнасці», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён падзякаваў жыхарам забруджаных рэгіёнаў, што шмат гадоў таму яны не пакінулі гэтыя землі і рабілі ўсё, каб забяспечыць добрае жыццё.

«Мы стараліся пры нашай беднасці грашовай не забываць пра чарнобыльскія раёны. Гаспадзь дапамог і падарыў нам гэта шчасце, што людзі тут больш здаровыя, чым у іншых раёнах Беларусі. Будзем цяпер на вас раўняцца. Таму самая галоўная выснова: ніколі, нідзе не трэба здавацца. Неабходна змагацца да апошняга, і тады прыйдзе перамога. Гэта галоўная выснова, якую я раблю з вопыту, што атрымаў тут», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Ён падзяліўся, што, калі пытаюцца аб найбольш значных дасягненнях яго і беларускага народа, азначае будаўніцтва незалежнай дзяржавы і перамогу над Чарнобылем.

«Яе (незалежнасць. — **«Зв.»**) цяжка цаніць, берагчы. Чаго б ні каштавала, нельга ўляпацца ў нейкі бруд, нельга дапусціць вайны. Вы ж бачыце, як зусім побач бяда ў нашых расіян і ўкраінцаў. Другая рэч, якую я заўсёды падкрэсліваю: калі мы нават і не перамаглі Чарнобыль, дык па мардасах яму надавалі моцна», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка краіны, людзі ў нас жывуць па-рознаму, але калі ўмеюць і жадаюць працаваць — добра.

«Я прыехаў з малочна-таварнага комплексу. Там я запытаў, які заробак у даяркі? Гэта адна з найлепшых гаспадарак у вас тут, і сярэдні па гаспадарцы заробак — пад 1800 рублёў. 1700 рублёў зарабляюць даяркі. Значыць, можна зарабляць. І ў гэтым плане мы будзем Гомельшчыну падтрымліваць. Мы вам накіравалі сюды крайні прэзідэнцкі рэзерв — былога міністра сельскай гаспадаркі губернатарам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і жартам папрасіў мясцовых не крыўдзіць Івана Крупко, бо тады яму самому прыйдзецца ехаць губернатарам на Гомельшчыну.

Кіраўнік краіны падзякаваў жыхарам Чачэрска за тое, што ў цяжкія часы яны засталіся на гэтай зямлі і рабілі шмат для аднаўлення рэгіёна.

«Я ўпэўнены, што амаль усе вы разумееце, што мы тады паступілі правільна. Каму вы былі патрэбны дзесьці там, нават у Беларусі?! Я сустракаўся з перасяленцамі, яны ўвесь час прасілі: «Вярніце назад». Многіх з іх, верагодна, ужо няма, бо ім тады было па 70—80 гадоў. Гэта была катастрофа з перасяленнем. Тады я ўпэўніўся, што мы тут павінны ствараць нармальныя ўмовы. Мы іх патроху стваралі. Магчыма, самі не шыкоўна пажылі, але дзецям будзе нармальнае жыццё», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што зараз у пацярпелых рэгіёнах можна жыць і працаваць. «У вас можна жыць і працаваць. Мы будзем рабіць усё, каб вам у гэтым дапамагчы», — заявіў ён.

Прэзідэнт падзяліўся з прысутнымі некаторымі аспектамі цяперашняй эканамічнай сітуацыі ў краіне з нагоды чутак аб магчымай адмене чарнобыльскіх ільгот. Санкцыі ён чарговы раз назваў магчымасцямі для беларускіх вытворцаў — айчынная прадукцыя будзе больш запатрабавана на рынках Расіі і Кітая.

«Палова Гомельскай вобласці — лясы. Дзесьці паўднёвей Украіны лес ёсць? Няма. А мэбля неабходна ўсім, дамы будаваць неабходна ўсім. Дык давайце навучымся прадаваць наша багацце і больш перапрацоўваць, — мяркуе кіраўнік краіны. — Мы, магчыма, не паспяваем перапрацоўваць лес. Ён не павінен перастойваць. Яго неабходна перапрацаваць і пажадана ў мэблю. І мы зойжем сваіх людзей, яны будуць атрымліваць годныя заробкі».

Па словах Аляксандр Лукашэнкі, стаяць у чарзе па айчынную сельскагаспадарчую тэхніку расіяне. За яе гатовы атрымліваць плату ў рублях, але тады і расійскі газ, нафту будзем купляць за рублі, расказаў пра дамоўленасці Прэзідэнт.

«Не трэба плакацца: санкцыі! Так, санкцыі — неабходна дзесьці варушыцца. Дык нас 30 гадоў імі бамбяць. Нам што, лягчэй было калісьці? Але мы знаходзілі шляхі. Нам закрывалі адну дарогу, мы ішлі па іншай. Не будзе санкцый — будзе канкурэнцыя», — заявіў кіраўнік краіны.

Ён адзначыў, што паставіць на калені Беларусь і Расію не атрымаецца з-за ўзроўню інтэлекту, адукацыі, тэхналогій і вялікіх рэсурсаў. Прэзідэнт расказаў, што знайшлі ў санкцыйны час новыя шляхі і айчынныя калійныя ўгнаенні, і прадукты харчавання, і сельскагаспадарчая тэхніка, і нафтапрадукты.

«Мы аптымізуемся, глядзім, каб грошы трацілі, куды неабходна. Мы сёння з губернатарам гаварылі не аб скарачэнні фінансавання. Наадварот — пра дапамогу Гомельскай вобласці, каб тут развівалася вытворчасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён прапанаваў не «размазваць» чарнобыльскія грошы па 10 рублёў у год кожнаму жыхару, а сабраць іх, напрыклад, для будаўніцтва станцыі абезжалезвання пітной вады.

«Ніякіх ільгот мы скарачаць не збіраемся. Хоць я праціўнік усякіх ільгот і называння вас чарнобыльцамі. Пакуль я Прэзідэнт, памятаю, з якога бруду мы тут выкараскаліся. Гэта не таму, што я такі герой гэта рабіў, а вы. Вы паслухаліся мяне», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён расказаў, што адна з яго мар, каб чарнобыльцы жылі даўжэй, чым у сярэднім людзі па краіне. Гэта будзе пацвярджэннем, што беларусы перамаглі Чарнобыль.

«Справа не ў ільготах, а ў тым, каб вам было дзе працаваць і нармальна зарабляць. Ды і пенсіянераў неабходна падтрымаць, як бы цяжка ні было», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Жыхары Чачэрскага раёна папрасілі Прэзідэнта на адкрыццё гэтым летам мемарыяльнага комплексу «Партызанская крынічка» пад Гомелем. У часы вайны там быў створаны партызанскі атрад «Бальшавік», які змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Кіраўнік краіны паабяцаў пастарацца наведаць мерапрыемства. «Назавіце канкрэтную дату, толькі загадзя, каб я мог спланаваць. Я пастараюся. Гамяльчане для мяне — асаблівыя людзі. Ніхто так не падтрымліваў мяне за ўсе гады прэзідэнцтва, як гамяльчане. Я гэта помню і цаню», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА,
г. Чачэрск.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіраўнік МЗС Швецыі заявіла, што яе краіна пакуль не прыняла рашэнне аб уступленні ў НАТА

Кіраўнік МЗС Швецыі Ан Ліндэ заявіла, што Стакгольм пакуль не прыняў рашэння аб уступленні ў НАТА. Яе словы прагучалі ў эфіры фінскага тэлеканала MTV.

«У Швецыі рашэнне аб далучэнні да НАТА яшчэ не прынятае. Абмеркаванне гэтага пытання ў парламенце пакуль працягваецца, і працэс далучэння да блока ў нас адрозніваецца ад фінскага», — сказала міністр, выступаючы ў Фінляндыі. Раней міністр замежных спраў Фінляндыі Пека Хаавіста заявіў, што яго краіна гатова падаць заяўку на ўступленне ў НАТА ў найбліжэйшыя тыдні незалежна ад таго, якое рашэнне прыме Швецыя. Да гэтага Генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг паабяцаў, што працэс уступлення Швецыі і Фінляндыі ў альянс будзе хуткі. Хельсінкі і Стакгольм загаварылі аб магчымасці ўступлення ў НАТА і адмовы ад шматгадовага нейтралітэту на фоне расійскай ваеннай аперацыі ва Украіне.

Польскае радыё паведаміла аб пастаўцы Варшавай ва Украіну звыш 200 танкаў Т-72

Улады Польшчы, паводле папярэдніх звестак, накіравалі ва Украіну больш як 200 танкаў Т-72, а таксама некалькі дзясяткаў баявых машын пяхоты (БМП). Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на Польскае радыё.

Па інфармацыі радыёстанцыі, падобнай колькасці танкаў можа хапіць для фарміравання дзвюх брыгад. Пры гэтым афіцыйных даных аб колькасці пастаўленай Кіеву ваеннай тэхнікі зараз няма. Акрамя таго, адсутнічаюць звесткі аб далейшых планах Варшавы датычна супрацоўніцтва з украінскім бокам. Раней прадстаўнік Крамля Дзмітрый Пяскоў заяўляў, што пастаўкі цяжкага ўзбраення Украіне і іншым краінам пагражаюць бяспецы кантынента.

ФСБ Расіі апублікавала дакументы аб самагубстве Гітлера

Федэральная служба бяспекі Расіі апублікавала дакументы асабістага пілота Гітлера генерал-лейтэнанта Ганса Баўра, у якіх ён расказаў аб акалічнасцях самагубства лідара нацысцкага рэйха. Пра гэта паведамляе РБК.

Дакументы Ганса Баўра, картка яго асабістай справы і паказанні, якія ён даваў падчас допытаў, размешчаны на сайце ФСБ РФ. Дзякуючы паказанням пілота, а таксама іншых людзей з акружэння Гітлера сталі вядомы падрабязнасці самагубства лідара нацысцкай Германіі і яго жонкі.

Са сведчанняў відавочцаў стала вядома, што Адольф Гітлер і яго жонка Ева Браўн скончылі жыццё самагубствам 30 красавіка 1945 года. 1 мая, папярэдне забіўшы сваіх шасцярых дзяцей, за імі рушылі ўслед міністр прапаганды нацысцкай Германіі Ёзэф Гебельс і яго жонка. 13 мая 1945 года контрразведчыкі «Смерш» у садзе рэйхсканцылярыі выявілі целы Адольфа Гітлера і Евы Браўн, сапраўднасць якіх была пацверджана ў выніку мноства экспертыз.

Інтэграцыя

КРОПКІ ЯДНАННЯ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем МЕЗЕНЦАВЫМ

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў сацыяльна-эканамічнай, навуковай, культурнай сферах, таксама ў цэнтры ўвагі былі канкрэтныя праекты і мерапрыемствы.

Наталля Качанава расказала аб юбілейных датах і прымеркаваных да іх мерапрыемствах, якія будуць ладзіцца ў нашай краіне ў Год гістарычнай памяці. Сярод іх — 1030 гадоў з часу заснавання першай на тэрыторыі беларускіх земляў Полацкай епархіі, ад якой вядзе адлік афіцыйная гісторыя Праваслаўнай царквы на тэрыторыі Беларусі. Сярод знакавых дат — і 1160 гадоў самаму старажытнаму гораду краіны Полацку.

Удзельнікі сустрэчы дэталёва абмеркавалі тэматыку Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які неўзабаве адбудзецца, а таксама пытанні падрыхтоўкі і рэалізацыі сумеснага патрыятычнага праекта «Цягнік памяці».

— Вельмі разлічваем на тое, што, як і Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, праект «Цягнік памяці» стане традыцыйным, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта вытокі, гісторыя, памяць. З кожным годам ветэранаў і сведак тых жудасных падзей становіцца ўсё менш, таму вельмі важна цяпер гэтую памяць захаваць дакладна, прыцягнуць да яе захавання моладзь, каб з пакалення ў пакаленне гэта перадавалася.

На завяршэнні сустрэчы было адзначана, што ў цэлым тая работа, якая праводзіцца ўрадамі, парламентарыямі, іншымі дзяржаўнымі структурамі ў межах Саюзнай дзяржавы, дастаткова паспяховая. Аднак спыняцца на дасягнутым, акцэнтавалі ўвагу спікеры, нельга: ёсць шмат пытанняў, над якімі яшчэ трэба будзе працаваць.

Вераніка КАНЮТА.

Парламенцкі дзённік

НОВЫ ІМПУЛЬС УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Адбыўся анлайн-семінар жанчын-парламентарыяў Беларусі і Кітая

Гэта першае падобнае мерапрыемства ў гісторыі двухбаковых узаемаадносін. Сімвалічна, што адбылося яно ў год 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных сувязяў дзвюх краін. Ініцыятыва, якая датычыцца развіцця жаночага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, агучаная Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай падчас сустрэчы кіраўніцтва Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь са Старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў КНР Лі Чжаньшу ў чэрвені мінулага года, была падтрымана.

Фота БелТА.

Падчас семінара абмеркавалі ролю жанчын-парламентарыяў у дзяржаўным кіраванні і садзейнічанні эканамічнаму, сацыяльнаму развіццю краіны, закранулі тэму абароны правоў і інтарэсаў жанчын, умацавання міжнароднага ўзаемадзеяння, а таксама падзяліліся вопытам профілактыкі і лячэння каранавіруснай інфекцыі.

У сваім выступленні Наталля Качанава закранула пытанні стану і перспектыў супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферы палітычнага дыялогу, па лініі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Асабліва ўвага была акцэнтавана на ўзаемадзеянні жаночых рухаў дзвюх краін.

— Жанчыны Беларусі і Кітая ўносяць важкі ўклад у захаванне нацыянальных традыцый, умацаванне інстытута сям'і, развіццё жаночага прадпрымальніцтва, павышэнне ролі жанчын у працэсах кіравання дзяржавай, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Мы, жанчыны добрай волі, можам многае для захавання міру і спакою ў нашых краінах, спынення нагнятання ваеннай, інфармацыйнай, псіхалагічнай істэрыі, распальвання нянавісці і агрэсіі паміж краінамі і народамі.

Спікер верхняй палаты парламента паведаміла кітайскім калегам, што самай шматкольскаснай жаночай грамадскай арганізацыяй у нашай краіне з'яўляецца Беларускі саюз жанчын, які ў снежні адзначыў свой 30-гадовы юбілей і налічвае звыш 150 тысяч жанчын з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. «Беларускі саюз жанчын і Усекітайская федэрацыя жанчын у сваёй дзейнасці прытрымліваюцца падобных мэт, прынцыпаў і каштоўнасцяў: садзейнічаюць абароне правоў і законных інтарэсаў жанчын, сям'і і дзяцей, імкнуцца да павышэння ролі жанчын у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці дзвюх краін», — звярнула ўвагу Наталля Качанава, падзякаваўшы калегам за аказанне матэрыяльнай дапамогі для развіцця жаночага руху Беларусі.

Падчас семінара жанчыны-парламентарыі дзвюх краін выступілі з дакладамі, абмеркавалі актуальныя пытанні, вызначаныя тэмай мерапрыемства. Акрамя таго, у межах семінара адбылася цырымонія падпісання Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Беларускім саюзам жанчын і Усекітайскай федэрацыяй жанчын.

Падпісаны мемарандум прадугледжвае такія формы ўзаемадзеяння, як абмен візітамі кіраўнікоў, абмен інфармацыяй па жаночай тэматыцы, а таксама па пытаннях мацярынства і дзяцінства, узгодненне пазіцый падчас міжнародных мерапрыемстваў, супрацоўніцтва экспертаў. Падпісаннем дакумента ствараецца прававы падмурак для далейшага супрацоўніцтва. Рэалізацыя мемарандума ўнясе свой уклад у прасоўванне гендарнай роўнасці і пашырыць правы жанчын.

— Пераканана, што мемарандум аб супрацоўніцтве дасць новы імпульс нашаму ўзаемадзеянню, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Беларусь прадпрымае рэальныя меры для паляпшэння становішча беларускіх жанчын, павышэння іх ролі ў развіцці краіны. Наш Прэзідэнт заўсёды падтрымлівае жанчын і жаночы рух. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі, жанчынам і мужчынам забяспечваюцца роўныя магчымасці ў атрыманні адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы, у працы і прасоўванні па службе, у грамадска-палітычнай, культурнай і іншых сферах.

Па словах спікера верхняй палаты, у мэтах захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў беларускага грамадства па выніках агульнанароднага абмеркавання і па выніках рэспубліканскага рэферэндума ў Канстытуцыі Беларусі замацавана палажэнне аб тым, што шлюб — гэта саюз жанчыны і мужчыны. «Пачынаючы з 1996 года, у нашай краіне рэалізоўваюцца пяцігадовыя нацыянальныя планы дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці, — заўважыла Наталля Качанава. — У цяперашні час прынята Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2035 года. Дзякуючы гэтым праграмным дакументам у нашай краіне дасягнута абсалютная роўнасць паміж мужчынам і жанчынай».

Вераніка КАНЮТА.

Добрая навіна

У маі павышаецца БПМ,

а разам з ім — дапамогі і пенсіі

З 1 мая ў Беларусі вырасце бюджэт пражытачнага мінімуму. Для працаздольнага насельніцтва ён складзе 347,20 рубля. Цяпер гэтая сума на ўзроўні 329,35 рубля. Разам з гэтым павялічацца сацыяльныя выплаты і даплаты, у прыватнасці дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, сацыяльныя пенсіі, надбаўкі пенсіянерам ад 75 гадоў, дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 22 красавіка 2022 года № 25 на перыяд з 1 мая да 31 ліпеня зацверджаны памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах. Бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 311 рублёў 15 капеек, што на 4,9 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 лютага да 30 красавіка 2022 года (цяпер — 296,55 рубля), паведамляе прэс-служба Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах устанаўліваюць наступныя памеры БПМ:

працаздольнае насельніцтва — 347,2 рубля (цяпер — 329,35 рубля);

пенсіянеры — 232,3 рубля (цяпер — 224,1 рубля);

дзеці ва ўзросце да трох гадоў — 194,36 рубля (цяпер — 187,04 рубля);

дзеці ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 270,81 рубля (цяпер — 259,47 рубля);

дзеці ва ўзросце ад шасці да васемнаццаці гадоў — 330,26 рубля (цяпер — 317,33 рубля).

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 мая 2022 года перагледжаны сацыяльныя выплаты і даплаты, якія вылічваюцца ад памеру БПМ. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, сацыяльныя пенсіі, павышэнні да пенсій, якія прадугледжаны для асобных катэгорый пенсіянераў, даплаты і надбаўкі пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Перагледжаны бюджэт адаб'ецца найперш на памеры выплат і даплат сем'ям з дзецьмі і пажылым грамадзянам. З 1 мая аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці будзе складаць пры нараджэнні першага дзіцяці — 3111,5 рубля, ці 10 БПМ, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 4356,1 рубля, ці 14 БПМ.

Павялічваюцца таксама памеры іншых дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, што залежаць ад БПМ. Варта адзначыць, што змяненне БПМ уплывае і на агульны памер выплат у перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Калі ў гэты перыяд у сям'і выхоўваюцца дзеці ад 3 да 18 гадоў, то сям'і выплачваецца яшчэ адна дадатковая дапамога ў памеры 50 працэнтаў БПМ. У выніку штомесяц сумарна сям'я будзе атрымліваць 772 рублі. Расходы на фінансаванне дапамог на дзяцей, якія вылічваюцца ад БПМ, у маі складуць каля 39 мільёнаў рублёў.

З 1 мая павялічацца таксама «ўзроставыя» даплаты да пенсій, атрымальнікамі якіх з'яўляюцца больш за паўмільёна беларусаў ва ўзросце 75 гадоў і старэйшыя. Памер гэтых выплат для людзей ва ўзросце 75—79 гадоў складзе 58,34 рубля, для 80-гадовых і старэйшых (з улікам надбаўкі на догляд) — 116,69 рубля. Расходы на іх фінансаванне ў маі складуць каля 47 мільёнаў рублёў.

Алена КРАВЕЦ.

У МУС адзначылі найлепшых журналістаў, якія асвятляюць міліцэйскую тэматыку

Сярод іх — і супрацоўнікі «Звязды»

Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ з рук кіраўніка міліцэйскага ведамства атрымаў ганаровую грамату Міністэрства ўнутраных спраў.

Аглядальнік рэдакцыі газеты Вераніка КАНЮТА атрымала дыплом у намінацыі «Праект года» — такім чынам, Міністэрства ўнутраных спраў адзначыла плённае супрацоўніцтва са «Звяздой». На працягу многіх гадоў на старонках выдання выходзіць сумесны праект з міліцэйскім ведамствам «Фарпост спакою», у якім расказваецца пра шматлікія падраздзяленні органаў унутраных спраў, унутраныя войскі МУС, прадстаўнікоў міліцэйскай прафесіі, дынастыі.

Як адзначыў падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ і інтэрнэце дзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войск МУС **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ,** сёння ў Рэспубліцы Беларусь спакойная аператыўная абстаноўка, нягледзячы на тое, што адбываецца каля нашых граніц. «На жаль, тыя дэструктыўна настроеныя грамадзяне, якія знаходзяцца за мяжой, не пакідаюць спроб «накачаць» нашу краіну шматлікага роду негатыўнай інфармацыяй, раскачаць сітуацыю, — заўважыў кіраўнік міліцэйскага ведамства. — І менавіта вы, журналісты, знаходзіцеся на перадавой інфармацыйнай барацьбы, падаяце патрэбную і праўдзівую інфармацыю — самае галоўнае, прафесійна і своечасова».

Згадваючы падзеі 2020 года, міністр унутраных спраў падкрэсліў, што менавіта журналісты сталі з супрацоўнікамі міліцыі ў баявыя разлікі і падтрымалі міліцыянераў, калі пагражалі іх сем'ям, калі на супрацоўнікаў унутраных спраў ліўся негатыў. Іван Кубракоў падзякаваў прадстаўнікам масмедыя за тое, што яны аператыўна і праўдзіва падавалі інфармацыю, што і працягваюць рабіць.

Кар. «Звязды».

КОЖНЫ САЛДАТ ПАВІНЕН ВЯРНУЦЦА З ФРОНТУ

Так лічаць пошукавікі, за работай якіх падчас раскопак у Дзяржынскім раёне назіралі карэспандэнты «Звязды»

Унікальнае падраздзяленне Міністэрства абароны, аналагаў якому няма ў свеце, — 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён — распачаў свой 28-ы пошукавы сезон. Толькі за апошнія пяць гадоў ваеннаслужачыя батальёна адпрацавалі больш чым 500 аб'ектаў, дзе былі знойдзены астанкі амаль 14 тысяч чалавек. Усе яны перапахаваны з воінскімі ўшанаваннямі, установлены 680 імён тых, хто да нядаўняга часу лічыўся зніклым без вестак.

З пачаткам красавіка пошукавікі адначасова працуюць на некалькіх аб'ектах у розных рэгіёнах Беларусі. Работы шмат як ніколі: акрамя месцаў пахаванняў чырвонаармейцаў, якія штогод уносяцца ў план абароннага ведамства, вядуцца раскопкі і на месцах масавага знішчэння мірнага насельніцтва, выяўленых Генеральнай пракуратурай у сувязі з узбуджанай год таму крымінальнай справай аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час.

Каб максімальна адпрацаваць усе 96 запланаваныя на гэты сезон аб'екты, у батальён быў дадаткова набраны яшчэ адзін пошукавы ўзвод. Пад кіраўніцтвам прадстаўнікоў Генпракуратуры ў межах крымінальнай справы раскопкі будуць праводзіцца на 27 пошукавых аб'ектах. Паралельна ваеннаслужачыя 52-га батальёна працягваюць весці палявыя пошукавыя работы ў межах дзяржаўнай праграмы па ўвекавечванні памяці аб загінулых пры абароне Айчыны. На адным з аб'ектаў — у Дзяржынскім раёне — пабывалі і карэспандэнты «Звязды».

ДВА БАІ — ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ЗАГІНУЛЫХ

Члены пошукавай групы «Бацькаўшчына», якія на працягу 30 гадоў займаюцца выяўленнем зніклых без вестак ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, знайшлі неабазначаныя пахаванні яшчэ мінулай восенню. Пакольні пошукавы сезон завяршаўся, раскопкі адклалі да вясны.

— Баявыя дзеянні тут праводзіліся ў два этапы: з 28 чэрвеня да 3 ліпеня, а таксама 11 ліпеня 1941 года, — уводзіць у курс справы **начальнік штаба пошукавай групы «Бацькаўшчына» Андрэй СУДАКОЎ**. — Падчас першага з-пад Беластока з акружэння выходзілі рэшткі нашых войскаў, у прыватнасці 21-га стралковага корпуса. Паводле апісання тых падзей немцамі, чырвонаармейцы ішлі хаатычна з розных кірункаў. Вораг займаў пануючыя вышыні. Каб не трапіць у поле зроку праціўніка, нашы канцэнтраваліся ў лясным масіве. Немцы стралялі з гармат, мінамётаў. Шмат савецкіх калон было разбіта.

Паводле дакументаў, 11 ліпеня тут знаходзіліся байцы 247-га стралковага палка 37-й стралковай дывізіі. «Гэта было баявое падраздзяленне пад кіраўніцтвам палкоўніка Дзям'яна Сакалова, — расказвае Андрэй Судакоў. — Па ўспамінах немцаў, нашы вайскоўцы дастаткова ўмела арганізавалі абарону. Для нямецкага падраздзялення, якое тут ваявала, гэта ўвогуле быў першы бой. Доўжыўся ён да самага вечара. Чырвонаармейцы, якія змагаліся з пяхотнай дывізіяй ворага, узброенай артылерыйскімі гарматамі, былі заблакіраваны ў лесе і знішчаны. Па нямецкіх даных, у той дзень у гэтых мясцінах загінула каля 560 чалавек. Амаль 70 чалавек трапіла ў палон. Калі яшчэ ўлічыць баі, якія адбыліся тут некалькімі днямі раней, на гэтым участку мясцовасці, рахнелі. Безыменным аказаўся і трэці салдат — пры ім увогуле нічога, акрамя гузіка, пражкі і маленькіх чырвоных скураных кавалачкаў (па версіі спецыялістаў, астанкаў ад партыйнага білета), нічога не знайшлі. Праўда, пошукавікі падняслі з зямлі дзве вінтоўкі — Мосіна і Токарава. Байцы адстрэльваліся: аб гэтым сведчаць напалову пустыя магазіны. Адна з вінтовак, хутчэй за ўсё, належала іншаму вайскоўцу — па меркаванні экспертаў, ён трапіў у палон.

Пры чацвёртым вайскоўцу, паднятым пошукавікамі, знайшлі запаветны медальён. Прычым не пусты, як гэта нярэдка бывае: многія чырвонаармейцы наўмысна іх не запаўнялі, бо верылі, што іначай загінуць.

— Медальён сведчыць, што мы выявілі астанкі Васіля Дзмітрыевіча Рачынскага, 1917 года нараджэння, прызванага ў Чырвоную Армію з Молакаўскага раёна Калінінскай вобласці, — адзначае **археолаг 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Вадзім ТАМІЛІН**. — Баец служыў у 168-м стралковым палку 24-й стралковай дывізіі. Падраздзяленне было акружана ў раёне Налібоцкай пушчы. Вайскоўцы выходзілі з акружэння, многія загінулі, у тым ліку салдат Рачынскі. Гэты баец цікавы тым, што з чырвонаармейскай кніжкі былі вырваны пятая і шостая старонкі, якія мы пры ім адшукалі: на іх пазначана назва падраздзялення, дзе ён служыў, нават чытаецца подпіс камандзіра, што дублюецца на медальёне.

Археолаг заўважае, што і медальён, і адпаведныя старонкі з чырвонаармейскай кніжкі запоўнены алоўкам, што забяспечыла добрую захаванасць дакумента. Сапраўды, асабістыя даныя загінулага выдатна чытаюцца нават без спецыяльнага абсталявання. «Чаго не скажаш у дачыненні да ўкладышаў, запоўненых чарнілами, якія размываюцца, аднак сучасныя сканавальныя сродкі дазваляюць выяўляць тое, што раней здавалася нечытаным, — удакладняе Вадзім Тамілін. — У выніку міфы аб тым, што большасць медальёнаў не запаўнялася, знікаюць. Сканаванне на першы погляд чыстых укладышаў паказвае, што яны ўсё ж такі запаўняліся, але чарнілами».

Сярод астанкаў, якія належалі вайскоўцу Рачынскаму, быў знойдзены рэчмяшок, дакладней, тое, што ад яго засталося. Сярод кавалкаў тканіны, бязлітасна пашкоджанай часам, быў знойдзены панталер для пераноскі сцяга. На версіі пошукавікаў, гэты чалавек з'яўляўся сцяганосцам. Спадзяваліся адшукаць і сцяг — гэта была б не проста рэдкая ўдача, а падзея касмічных маштабаў. Не атрымалася. Праўда, ужо той факт, што ўстанавілі хоць адно імя, сведчыць аб тым, што работа зроблена недарэмна, — на аднаго зніклага без вестак стала менш.

Усе спадарожныя знаходкі будуць перададзены мясцоваму ваенкамату. У выніку найбольш цікавыя рэчы стануць музейнымі экспанатамі. Заняць месца ў экспазіцыі ёсць усе шанцы і ў савецкага чырвонца, а таксама іншых купюр, знойдзеных у скрыначцы ад папяросных звестках, палягло каля дзвюх тысяч нашых байцоў».

Выявіць астанкі ўсіх загінулых — задача непасільная. За гэты час мясцовасць моцна змянілася, на некаторых участках вырас лес. За два дні работы 52-га пошукавага батальёна Міністэрства абароны ў розных месцах знайшлі астанкі чатырох вайскоўцаў Чырвонай Арміі. Усе яны будуць перапахаваны з воінскімі ўрачыстасцямі там, дзе вырашыць мясцовая ўлада. Увогуле, пачынаючы з 2007 года, у лесе, а таксама на тэрыторыі, якая да яго прылягае, былі знойдзены астанкі каля 40 чалавек.

— Адшукаць пахаванне чырвонаармейца нам дапамагаюць рэчы, якія яму належалі, — заўважае начальнік штаба пошукавай групы «Бацькаўшчына». — Сам факт знаходжання каскі — гэта ўжо 50 працэнтаў таго, што побач павінен быць і гаспадар.

ГАЛОЎНАЕ Ў ПОШУКУ — ЗНАЙСЦІ МЕДАЛЬЁН

Менавіта дзякуючы кассцы, дакладней, таму, што ад яе засталося, у адным месцы знайшлі астанкі адразу двух байцоў. Медальёны, якія знаходзіліся пры іх, на жаль, імёны ўстанавіць не дапамаглі: па версіі спецыялістаў, гэтыя чорныя капсулы, у якія ўкладваецца інфармацыя аб вайскоўцу, былі разбітыя аскепкамі: укладышы поўнасцю спапроцівагаза. Не выключана, што грошы належалі ўстаноўленаму салдату.

МАРАЛЬНЫ АБАВЯЗАК

За сваю 30-гадовую гісторыю члены пошукавай групы «Бацькаўшчына» знайшлі астанкі каля трох тысяч чалавек. За гэты час удалося ўстанавіць нямала імёнаў. Вайскоўцы 52-га батальёна прызнаюцца, што падобныя аб'яднанні, калі яны ажыццяўляюць сваю работу так, як патрабуе гэтага заканадаўства, ім вельмі дапамагаюць у пошукавай дзейнасці.

У свой час «Бацькаўшчына» была створана са студэнтаў Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі. Сабраліся аднадумцы, прыцягнулі школьнікаў. Узначаліў пошукавую групу студэнт першага курса Аляксандр Дударонак. Цікавасць да тэмы вайны ў яго з'явілася ў арміі. «Служыў пад Казельскам, на месцы баёў 1942 года, — расказвае пошукавік. — Нас рэгулярна выводзілі на вучэнні ў лес: ідзём, а там то бот тырчыць з зямлі, то косці чалавечыя, то чэрап зверху ляжыць. Такія глухія мясціны былі: напэўна, як скончылася вайна, так нага чалавека туды і не ступала».

Першае, што ён зрабіў, калі вярнуўся з войска, — паехаў у родныя мясціны. «У мяне дзед у 1941 годзе на сваім хутары ў Слонімскім раёне пахаваў 39 салдат, — расказвае Аляксандр Дударонак. — Нашы прарываліся з акружэння, на хутары адпачывалі тылавыя нямецкія часці. Быў бой. Савецкія салдаты загінулі, немцы далі каманду іх пахаваць. Дзед расказваў, што выкапалі яму пяць на шэсць метраў і паклалі адзін каля аднаго. Мая прабабуля хадзіла з чайнікам — змывала ім пыл з твараў. Паглядзелі дакументы — сярод загінулых было шмат татараў і калмыкаў. Калі ў мяне з'явілася жаданне знайсці гэтых салдат і перапахаваць, дзед ужо памёр, а бабуля, баючыся асуджэння аднавяскоўцаў, магілу мне не паказала. З таго часу колькі ўжо байцоў у акрузе знайшлі, а на пахаванне 39 вайскоўцаў трапіць ніяк не атрымліваецца».

Пошукавікі ганарацца тым, што не проста знаходзяць палеглых байцоў, устанаўліваюць іх імёны, але і аднаўляюць гісторыю. Яны валодаюць унікальным архіўным матэрыялам, у тым ліку данясеннямі нямецкіх часцей, вялікім масівам фотадакументаў і нямецкай відэахронікі. «Нельга, каб забітыя людзі былі раскіданыя па палях і лясах, — перакананы **кіраўнік пошукавай групы «Бацькаўшчына» Аляксандр ДУДАРОНАК**. — Іх шукаюць: мне пастаянна прыходзяць запыты на вышук тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Нікому не магу адмовіць — трэба дапамагчы гэтым салдатам вярнуцца дахаты з фронту».

У нашай краіне нямала аб'яднанняў, якія займаюцца пошукавай дзейнасцю. Усе яны, як правіла, адзін аднаго ведаюць — пошукавікі часта працуюць ва ўзаемадзеянні. Прычым не толькі ўнутры краіны, але і па-за яе межамі. У гэтых раскопках у Дзяржынскім раёне, у прыватнасці, удзельнічала і пошукавік з Расійскай Федэрацыі.

Як расказала **кіраўнік службы вышуку сем'яў савецкіх ваеннаслужачых, якія загінулі і зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны, «Пошукавага руху Расіі» Аксана МУХА**, у сярэднім за год яны знаходзяць каля 50—60 свайкоў. Цяпер у вышуку — 400 салдат, свайкоў якіх спрабуюць знайсці. «Калі ты пачынаеш вывучаць біяграфію салдата, разумееш, наколькі ўсе сем'і пацярпелі ад гэтай вайны, — адзначае Аксана Муха. — Гісторыі вельмі асабістыя. Адзін, сыходзячы на фронт, сказаў: «Беражы мае фарбы, мама, я вярнуся». Або калі сын знік без вестак, маці нікому не аддавала яго паліто і казала: «А раптам сын вернецца з вайны і яму не будзе чаго насіць». Наша жыццё цудоўнае ў параўнанні з тым, што яны перажылі, калі ў цябе сыходзяць тры сыны на фронт і ні адзін не вяртаецца».

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.
Дзяржынскі раён.

Падзея

МАТЧЫН ГОНАР

Ваеннаслужачыя тэрміновай службы, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у службовай дзейнасці, атрымалі ўзнагароды і падарункі з рук міністра абароны

Такога высокага прызнання з боку вышэйшага ваеннага кіраўніцтва атрымалі 60 салдат і сяржантаў з розных вайсковых часцей і падраздзяленняў Узброеных Сіл Беларусі. Побач з імі ў такі адказны дзень былі самыя дарагія людзі — матулі, якім уручылі падзячныя лісты.

Міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН выказаў удзячнасць усім бацькам, чые сыны служаць у арміі, акцэнтаваўшы ўвагу, што яны выхавалі патрыётаў нашай краіны. «Заўсёды прыемна казаць людзям словы падзякі, — заўважыў кіраўнік абароннага ведамства. — Гэта стала добрай традыцыяй ва Узброеных Сілах. Ваеннаслужачых, якія дабіліся добрых вынікаў, ушаноўвае не толькі міністр абароны. Такія мерапрыемствы праходзяць на ўзроўні ўсіх камандаванняў, злучэнняў, вайсковых часцей, дзе ўсім хлопцам, якія годна заканчваюць воінскую службу, кажуць словы падзякі».

Па словах міністра абароны, больш чым 6,5 тысячы маладых людзей заканчвае службу і пачне звальняцца ў маі.

«Адна з галоўных мэт сённяшняй урачыстасці — падкрэсліць, што мы хочам міру, стабільнасці і спакою ў нашай краіне, — удакладніў Віктар Хрэнін. — Нашы воіны сыходзяць «на грамадзянку», прайшоўшы ўнікальную армейскую школу, атрымаўшы добры жыццёвы вопыт і спазнаўшы сапраўднае мужчынскае сяброўства. Паўтара года таму яны прыходзілі зусім іншыя. Цяпер гэта памужнелыя хлопцы, якія засвоілі самую што ні ёсць мужчынскую прафесію, на справе даказаўшы сабе, сваім родным і блізкім, што яны — сапраўдныя абаронцы Радзімы».

Каб раздзяліць радасць з сынам, з Гродна прыехала Тамара Агеенка. Віталь заканчвае службу ў 38-й асобнай дэсантна-штурмавой брыгадзе. «Хачу падзякаваць нашай беларускай арміі, якая выхавала годных абаронцаў Айчыны, — адзначыла маці вайскоўца. — Ганаруся сваім сынам, я за ім як за каменнай сцяной. За час службы мой сын памужнеў, стаў сур'ёзным, прыгожым, моцным маладым мужчынам. Хачу сказаць юнакам, якія збіраюцца служыць: не бойцеся цяжкасцяў! Бацькі будуць ганарыцца вамі так, як і я сёння ганаруся сваім сынам».

Як прызналася маці ваеннаслужачага 19-й асобнай механізаванай брыгады Антона Альнёва, калі яна даведалася, што яе сын — сярод найлепшых, было прыемна і хвалюючa. «За час службы мой сын стаў дарослым, памужнеў, — заўважыла Тамара Альнёва. — Раней ён быў нароўні са мной, цяпер — на дзве галавы вышэйшы. Ганаруся ім. Па першым часе, калі Антон пайшоў у армію, я перажывала (выхоўвала яго адна), але сын тэлефанаваў, расказваў пра службу, і я супакоілася. Была і ў вайсковай часці, куды мяне запрашалі на Дзень маці. Не трэба баяцца адпускаць дзяцей у армію, там усё добра!».

Па словах камандзіра мотастралковага аддзялення Ілы Маскалёва, служба ў арміі прайшла хутка і цікава. «На мне сёння сяржанцкія пагоны, — пахваліўся салдат тэрміновай службы. — Увесь гэты час я добрасумленна выконваў свае абавязкі, адстойваў інтарэсы батальёна на рэспубліканскім узроўні. Для юнакоў, якія будуць прызывацца на тэрміновую ваенную службу, галоўнае — жаданне. У арміі бяспечна, і служба пройдзе паспяхова».

Як прызналася маці Ілы, яна спіць спакойна, бо ўпэўнена, што сын у бяспецы. «Ведаю, што адбываецца ў часці: камандзіры і афіцэры, якія непасрэдна працуюць з нашымі дзецьмі, дасылаюць фотаздымкі і расказваюць аб службе, — заўважыла Алена Маскалёва. — У мяне з першага дня, як мой сын трапіў у армію, быў нумар тэлефона камандзіра, з якім я ў любы момант магла звязацца, калі б мяне нешта хвалявала».

Кожны з ваеннаслужачых, адзначаных на мерапрыемстве, атрымаў з рук міністра абароны мерч Першага «Вы красавцы!». Асаблівым падарункам для гасцей урачыстасці стала экскурсія ў Палац Незалежнасці.

Вераніка КАНЮТА.
Фота «Ваяр».

Год гістарычнай памяці

УРОК МУЖНАСЦІ КАЛЯ ЗЯМЛЯНКІ ВАРАНЯНСКАГА

Школьнікі Лагойскага раёна разам з краязнаўцамі адшукалі месца, дзе ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны базіраваўся атрад знакамітага камбрыга

У першыя месяцы акупацыі на Лагойшчыне пачалася ўзброеная барацьба з ворагам, з'явіліся першыя партызаны. Адна з партызанскіх груп у той час базіравалася ў лесе недалёка ад вёскі Астрошыцы. Вучні Астрошыцкай школы вырашылі знайсці ў лесе тую першую зямлянку групы маёра Варанянскага, з якой вырас спачатку партызанскі атрад «Мсціевец», а потым брыгада «Народныя мсціўцы».

ПОШУКІ ЗЯМЛЯНКІ

Пажылыя мясцовыя жыхары, якія перажылі акупацыю, указалі на прыкладнае месцазнаходжанне партызанскай зямлянкі групы дзядзькі Васі — так партызаны, маладыя хлопцы, называлі маёра Васіля Варанянскага, якому ў той час ужо было больш за 40 гадоў. У склад нашай невялікай пошукавай групы, акрамя мяне, увайшлі настаўніца Алена Макуцэвіч з мужам Сяргеем, школьнікі Дар'я Рахоўская і Павел Жураўлёў.

Падчас першага паходу мы некалькі разоў прачасалі прыкладны ўчастак лесу, але знайсці зямлянку не атрымалася, нягледзячы на тое, што мясцовыя грыбнікі расказвалі — раней яны часта выходзілі на месца яе размяшчэння. Задачу ўскладніла высечка дрэў, якая праводзілася тут некалькі гадоў таму. Мясцовасць змянілася, таму прыйшлося шукаць месца базіравання першых партызанаў некалькі разоў.

Арыенцірам стала рэчка Дуброўка — па ўспамінах тутэйшых, зямлянка знаходзілася недалёка ад ракі. Да пошукаў падключыўся мінчанін А. Трафімчык, які часта прыязджае да сваякоў на Лагойшчыну. Менавіта ён знайшоў месца былой зямлянкі. Яна размяшчаецца на схіле ўзвышша, прыкладна за 50 метраў ад Дуброўкі, што цячэ па лесе. Партызаны ўмелі выбіраць месца для свайго прыстанішча. Вада заўсёды была патрэбная: і для таго каб памыцца, і для гатавання ежы. Вось тут, у непрыкметным месцы, і выкапалі зямлянку першыя лагойскія партызаны ў кастрычніку 1941 года.

Праўда, ад яе застаўся невялікі катлаван у зямлі, з бакоў якога захавалася некалькі фрагментаў гнілых жэрдак з шалёўкі сцяны. Дзікія звяры выкарыстоўвалі збудаванне ў сваіх мэтах — у яме праглядаюцца норы. Цікава, што партызаны прадугледзелі адыход на выпадак нападзення ворага: ад зямлянкі ў бок ракі ідзе неглыбокая траншэя ў зямлі. Агледзеўшы яму і наваколле, знайшлі заржавелыя за столькі гадоў прадметы быту партызанаў: сякеру і дзве рыдлёўкі, вядро і цвік. Рэчы перададзены на захоўванне ў Лагойскі краязнаўчы музей імя Тышкевічаў.

ПЕРШЫЯ ПАРТЫЗАНЫ

Тут, каля зямлянкі, успомнілі гісторыю з'яўлення ў гэтых мясцінах маёра Варанянскага і яго трагічны лёс. Васіль Варанянскі разам з некалькімі акружэнцамі з'явіўся ў Кандратавічах у сярэдзіне ліпеня 1941 года. У пачатку вайны ён быў камандзірам 570-га асобнага батальёна сувязі 13-й арміі. Пасля таго як яго батальён у баях з немцамі быў разбіты пад Заслаўем, Варанянскі накіраваўся на ўсход праз Лагойскі раён, каб дагнаць войскі. У Кандратавічах ён сустрэўся з даваенным старшынёй калгаса «Чырвоная зорка» Іванам Івінскім, які забяспечыў ім харчаванне і начлег. Тут яны даведаліся пра апошнія навіны аб становішчы на фронце: аказалася, што Чырвоная Армія ўжо даволі далёка адышла ад гэтых мясцін.

Варанянскі прыняў рашэнне застацца ў тыле ворага, каб тут працягваць барацьбу з акупантамі. Дапамагалі партызанам мясцовыя камуністы з вёскі Чудзенічы — браты Шчурэвічы. Вялікую падтрымку прадуктамі, медыкаментамі і разведкай аказвала сям'я фельчара Адама Шавеля з вескі Астрошыцы. У той час каля Чудзеніч апынулася невялікая група байцоў на чале са старшым лейтэнантам Аляксандрам Макаранкам. Пасля сустрэчы абедзве групы аб'ядналіся, а камандзірам выбралі маёра Варанянскага. Група складалася з 11 партызанаў.

Пастаянна знаходзіцца ў вёсцы не было магчымасці, таму было прынята рашэнне абсталяваць у лесе зямлянку. Пасля праведзенай разведкі партызаны знайшлі зручнае месца каля левага берага ракі Дуброўкі. У матэрыялах Нацыянальнага архіва паведамляецца: «8-10.10.41. У Кандратаўскім лесе Лагойскага раёна адкапана зямлянка для групы».

Жыхары Кандратавіч успамінали, што партызаны прыходзілі ў школу праводзіць сходы з мясцовымі камуністамі. Настаўнікі Мікалай Аўчыннікаў, Надзея Мураўёва, Сяргей Тарасевіч былі на сувязі з партызанамі, перапісвалі і распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі зброю. У выніку была створана падпольная арганізацыя. У лютым 1942 года атрад значна вырас: ён актыўна папаўняўся былымі чырвонаармейцамі і чыгуначнікамі з Мінска. Літаральна праз месяц злучэнне апынулася пад пагрозай нападзення немцаў, і Варанянскі з партызанамі перайшоў у Руднянскі лес, а потым знаходзіўся ў былым Плешчаніцкім раёне. Тут атрад вырас да брыгады «Народныя мсціўцы».

Жыццё Васіля Варанянскага абарвалася трагічна. У ноч з 13 на 14 верасня 1943 года камбрыг выляцеў у Маскву. Пры пералёце лініі фронту ў раёне горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці самалёт быў збіты нямецкім знішчальнікам. За арганізацыю партызанскага руху ў тыле ворага В. Варанянскі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Аб лёсе гэтага мужнага чалавека, а таксама ўвогуле аб гісторыі атрада Варанянскага, школьнікі даведаліся на ўроку мужнасці, які прайшоў каля былой партызанскай зямлянкі. Да дрэва была прымацавана загадзя зробленая вучнямі шыльдачка, якую дапамагла афарміць настаўнік працоўнага навучання Кацярына Асташэвіч. Надпіс на ёй абвяшчае: «На гэтым месцы з кастрычніка 1941 года да красавіка 1942 года знаходзілася зямлянка партызанскай групы маёра В. Т. Варанянскага».

Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,
фота аўтара.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту: «Многоквартирный жилой дом с подземной автостоянкой и встроенными объектами обслуживания в границах ул. Пригородной, Гая»

Сведения о застройщике.

1. Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566. Юридический адрес: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

- усадебные жилые дома №№ 1, 7, 9, 11 по ул. Лапоровичской, №№ 20, 22 по ул. Пильницкой, блокированные жилые дома №№ 2, 4, 7, 12, 14, 16 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства 36 месяцев,

- квартира № 1 в блокированном доме № 6 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства 39 месяцев,

- квартира № 2 в блокированном доме № 6 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства 48 месяцев,

- блокированные жилые дома №№ 1, 3, 5, 8, 10, 16 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства 48 месяцев,

- блокированные жилые дома № 1 по ул. Зацень, №№ 1, 3, 5, 7, 9, 11, 13, 15, 17, 19 по ул. Банцеровской – фактический срок строительства 58 месяцев,

- жилой дом № 58 по ул. П. Панченко – фактический срок строительства 17 месяцев.

2. Цель строительства объекта «Многоквартирный жилой дом с подземной автостоянкой и встроенными объектами обслуживания в границах ул. Пригородной, Гая» (далее – объект), общей площадью жилых помещений 8065,28 кв. м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических лиц.

Начало строительства объекта – 15 апреля 2020.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию объекта – 15 сентября 2022.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.08.2019 № 455-15/19, от 29.01.2020 № 838-15/19 (дополнение), от 10.08.2020 № 402-15/20.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решениями Мингорисполкома от 19.09.2019 № 2895, от 13.02.2020 № 407, от 28.12.2020 № 4110. Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации № 500/849-9823, № 500/1802-2006.

Извещение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 14.04.2020 № 03/132 о регистрации объекта.

Генеральный подрядчик – ОАО «Стройтрест № 35» (договор строительства объекта № 301 от 03.04.2020).

В коммунальную собственность г. Минска безвозмездно передается 3,8 % с общей площади жилых помещений объекта, за исключением общей площади жилых помещений, строящихся за счет средств республиканского и (или) местных бюджетов, а также для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (за исключением граждан, признанных нуждающимися в улучшении жилищных условий по дополнительным основаниям, предусмотренным организациями в коллективных договорах), но не менее общей площади жилых помещений коммунальной собственности, использованных для отселения граждан из подлежащих сносу жилых домов с площадки строительства объекта.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 05.08.2021 № 2368 «Об организации строительства» в редакции решения Мингорисполкома № 777 от 24.03.2022 строительство жилых помещений в составе объекта осуществляется по договорам создания объекта долевого строительства, при заключении которых предпочтение необходимо отдавать гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи направлений администрациями районов г. Минска.

Проектируемый жилой дом расположен в квартале индивидуальной жилой застройки.

Участок в границах работ площадью 1,174 га расположен в Центральном районе г. Минска. С севера участок ограничен Земледельческим переулком с перспективой расширения ул. Пригородной по утвержденному детальному плану, с юга – жилой многоквартирной застройкой, с запада – жилой усадебной застройкой, с востока – разворотным кольцом ДП «Карастяновой».

Жилой дом запроектирован 10-этажным 3-секционным со встроенными помещениями административно-торгового назначения и одноуровневой подземной автостоянкой, с совмещенной плоской кровлей с внутренним водостоком. Здание запроектировано в монолитном железобетонном каркасе.

В качестве наружных ограждающих конструкций приняты блоки из ячеистого бетона, устанавливаемые поэтажно на перекрытия с лицевой отделкой системой «вентилируемый фасад» с металлическими кассетами, с утеплением бетонных конструкций минераловатными плитами.

В подземном уровне размещены: автостоянка для хранения автомобилей на 94 машино-места, технические и служебные помещения.

На первом этаже жилого дома предусмотрены входы в секции жилого дома, расположены встроенные помещения административного и административно-торгового назначения с автономными входами со стороны проезда (всего 8 блоков) и помещения для технического обслуживания и эксплуатации здания, колясочная, помещение диспетчера, кладовые уборочного инвентаря.

На эксплуатируемой кровле подземной одноуровневой автостоянки организована внутренняя озелененная дворовая территория с набором детских игровых площадок и площадок для хозяйственно-бытовых нужд.

Конструктивная схема здания предполагает возможность свободной планировки внутри отдельной квартиры.

Всего в жилом доме запроектировано 141 квартира:
- однокомнатных – 86 (в т. ч. 26 квартир-студий);
- двухкомнатных – 20;
- трехкомнатных – 35.

Все квартиры жилого дома имеют летние помещения.

В проектируемом здании предусмотрено 6 лифтов. Здание выполнено с учетом обеспечения доступа в квартиры маломобильных групп населения.

Конструкция окон и балконных дверей – из профиля ПВХ с заполнением двухкамерным стеклопакетом.

Остекление лоджий – из алюминиевого профиля с одинарным остеклением или в квартирах с единственной инсолируемой комнатой – экранное ограждение из многослойного безопасного стекла.

В состав общего имущества по объекту входят: лестничные клетки, лестницы, лифт, лифтовые и иные шахты, коридор, крыша, чердак и подвалы, другие места общего пользования, несущие ограждающие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящиеся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т. ч. вне площадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Долевое строительство данного объекта осуществляется в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

3.1. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства, при заключении которых предпочтение отдается гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи направлений администрациями районов г. Минска предлагается 32 жилых помещения (без выполнения внутренних отделочных работ) с учетом приобретения машино-места, в том числе:

- 3 (три) двухкомнатные квартиры общей площадью от 60,38 до 65,28 м²;
- 29 (двадцать девять) однокомнатных квартир общей площадью от 39,79 до 45,86 м².

Предметом договора на указанные помещения будет являться долевое строительство квартиры и машино-места.

3.2. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для физических и юридических лиц предлагается 7 помещений административного и административно-торгового назначения общей площадью от 41,65 до 58,56 кв. метров.

4. Стоимость строительства составляет:

4.1. жилых помещений для юридических лиц и физических лиц, **не состоящих** на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий – 2 500 (две тысячи пятьсот) белорусских рублей за 1 м²;

4.2. жилых помещений для граждан, **состоящих** на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

- за 1 м² нормативной площади – 1 995,14 рубля (одна тысяча девятьсот девяносто пять рублей 14 копеек).
- за 1 м² площади, превышающей нормативную – 2 700,0 рублей (две тысячи семьсот рублей 0 копеек);

4.3. одного машино-места – 54 610,04 рубля (пятьдесят четыре тысячи шестьсот десять рублей 04 копейки);

4.4. помещений административного и административно-торгового назначения – сумма в белорусских рублях, эквивалентная 1 350 (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США за 1 м².

Стоимость квадратного метра квартир и административных помещений сформирована без учета затрат застройщика, не включенных в сводный сметный расчет стоимости строительства объекта долевого строительства, но относимых на стоимость строительства. Данные затраты будут предъявлены дольщику по окончанию строительства с заключением дополнительного соглашения.

5. Условия оплаты.

5.1. Для жилых помещений, строительство которых осуществляется физическими и юридическими лицами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий. Первоначальный взнос в размере 30 % стоимости объекта долевого строительства вносится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору. По заявлению дольщика цена договора может быть оплачена единовременно.

5.2. Для жилых помещений, строительство которых осуществляется гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий. Первоначальный взнос в размере 30 % стоимости объекта долевого строительства вносится в течение 25 (двадцати пяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

5.3. Для помещений административного и административно-торгового назначения. Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на день платежа, но не более курса белорусского рубля к доллару США, установленного Национальным банком на 27.04.2022. Платежи вносятся на специальный и расчетный счета застройщика по графику платежей – первоначальный взнос в размере, установленном графиком платежей, в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору. По заявлению дольщика цена договора может быть оплачена единовременно.

6. Для подачи заявления и заключения договора необходимо:

6.1. Для юридических лиц и физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (на жилые и(или) административные помещения):

- личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор, с предоставлением паспорта (+ копии паспорта);
- копия свидетельства о государственной регистрации, документ, подтверждающий полномочия на представление интересов, копия Устава (для юридического лица).

6.2. Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

- личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор, с представлением:
- паспорта (+ копии паспорта);
- справки о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий со сверкой,
- документа, подтверждающего статус многодетной семьи (при наличии).

Для доверенных лиц, представляющих интересы доверителя, необходимо наличие оригинала и копии нотариально заверенной доверенности на представление интересов физического лица в отношении долевого строительства.

7. Документы для заключения договоров будут приниматься с **06 мая 2022 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента заключения и исполнения договоров создания объекта долевого строительства на все количество продекларированных помещений.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел.: (017) 251-07-26, +375 29 311 15 15.**

8. Проектные декларации, опубликованные в газете «Звязда» от 20.08.2021 № 159 (29528) и от 19.03.2022 № 54 (29676), считать утратившими силу с даты опубликования настоящей декларации.

Проведение первых повторных торгов по продаже имущества ООО «БИПТ Регион»

№ лота	Наименование лота	Начальная цена, руб.	Задаток 10 %, руб.	Шаг торгов 5 %, руб.
1	Весы электронные автомобильные ВСА-60	26 100,00	2 610,00	1 305,00

Первые повторные торги в форме открытого аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. Амураторская, д. 46-6, **16 мая 2022 г., в 10.00**. Продавец – ООО «БИПТ Регион», тел. +37525-6669987. **Заявление на участие в торгах и необходимые в соответствии с законодательством документы (платежный документ с отметкой банка, копии устава, доверенность, паспорт, приказ), должны быть поданы с 09.00 30.04.2022 по 17.00 12.05.2022 по адресу организатора торгов.** Задаток на участие в торгах должен быть перечислен по **12.05.2022** на счет организатора торгов – ООО «Кулонплюс», УНП 193367583, г. Минск, ул. Амураторская, д. 46-6, тел. +375259113010, р/с BY94AEBK30120047268500000000 в ЗАО «БТА Банк» код AEBKBY2X. Участник торгов в момент подачи заявления на участие в торгах обязан заключить с организатором торгов договор о залоге и зарегистрироваться в журнале регистрации участников. Победителем признается лицо, предложившее наивысшую цену в ходе торгов, а в случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного участника (претендента на покупку), тот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. По результатам торгов организатором составляется протокол, отражающий ход и результат их проведения, указывается победитель торгов, а в случае участия лишь одного участника – ему предлагается приобрести лот по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, пер. Березовый, д. 7, предварительно согласовав время визита. Цена указана без учета НДС по ставке 20 %. Победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 5 дней с даты торгов возмещаются затраты, связанные с организацией и проведением торгов, в том числе на публикацию объявлений о торгах в размере 136,80 руб., а также аукционный сбор в размере 5 % от окончательной цены продажи лота с учетом НДС. Срок подписания договора купли-продажи по 16.05.2022, оплата предмета торгов – не позднее 15.06.2022.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-24117 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный цех), общей площадью 1002,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001009305 (целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания квасильно-засолочного цеха), площадью 0,3377 га по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж. Начальная цена продажи лота – 7 140 руб. (семь тысяч сто сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 714 руб. (семьсот четырнадцать рублей)
Условия проведения аукциона – аукцион без условий
Продавец – Слонимский филиал Гроднооблпотребобщества, 231800, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-663-38

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012 05008332 25001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 16 мая 2022 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 09.02.2021 г.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18
Последний день приема заявлений – 12 мая 2022 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 24 мая 2022 года аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 332-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Арендодатель имущества	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Наименование и целевое использование имущества
95	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, тел. +375 (163) 49-53-04	Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Вокзальная, 6/5	12,90	3,0	54,50	Здание под организацию розничной торговли, размещение сотрудников, оказание услуг, размещение склада. **Аренда сроком на 3 года**
96		Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Вокзальная, 6/6	28,10	3,0	118,72	Помещение под организацию розничной торговли, размещение сотрудников, оказание услуг, размещение склада. **Аренда сроком на 3 года**
97	УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, тел.: +375 17 225 22 25, +375 17 225 66 22	Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Вокзальная, 11	10,20	3,0 (7,65БАВ)	43,10	Помещение для организации розничной торговли продовольственной и непродовольственной группой товаров (кроме товаров бывших в употреблении, товаров ритуального назначения) **Аренда сроком на 5 лет**
98	РУП «Белстройцентр», тел.: +375 17 317 12 16, +375 29 218 29 86	г. Минск, ул. Притыцкого, 87	18,20	7,1 БАВ	76,90	Подземный этаж под хранение транспортного средства. **Аренда сроком на 3 года**
99		г. Минск, ул. Притыцкого, 87	18,30	7,1 БАВ	77,32	Подземный этаж под хранение транспортного средства. **Аренда сроком на 3 года**

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10. Аукцион состоится **24 мая 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 29 апреля 2022 г. по 18 мая 2022 г.** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). Телефон для справок +375 (17) 360 42 22

АД «ЗАРНІЧКІ» ДА «АРЛЯНЯЦІ»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, некалькі дзяўчат выказалі жаданне асвойваць разам з хлопцамі менавіта дапрызыўную, а не медыцынскую падрыхтоўку. Гэты іх выбар тлумачыцца жаданнем працягнуць навучанне ў ВНУ так званых сілавых ведамстваў. А педагогі цэнтра забяспечылі іх максімальна поўнай інфармацыяй, дзе яны гэта могуць зрабіць, бо, акрамя Ваеннай акадэміі і Акадэміі МУС, ёсць яшчэ і Інстытут пагранічнай службы, і ВНУ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, і ваенныя факультэты ў грамадзянскіх ВНУ.

Сапраўдным гонарам цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі з'яўляецца суперсучасны цір, дзе можна пастраляць і з лазернай, і з пнеўматычнай зброі. Ён настолькі добра аснашчаны, што неаднаразова станавіўся месцам правядзення гарадскіх спаборніцтваў самага рознага ўзроўню.

«І вось у такой сітуацыі ты разумееш, што і час, і сілы аддадзены недарэмна».

— Адкрыццё Цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі стварыла шыкоўныя магчымасці для падрыхтоўкі нашых навучэнцаў да ўдзелу ў ваенна-патрыятычных гульнях «Зарнічка», «Зарніца» і «Арляня», — расказвае дырэктар гімназіі. — На працягу апошніх шасці гадоў нашы выхаванцы станавіліся пераможцамі раённага, гарадскога і рэспубліканскага этапаў «Зарніцы» ў Брэсце. Яны традыцыйна займаюць прызавыя месцы, таму што вельмі добра падрыхтаваныя. Пачыналі мы з «Зарніцы», потым пайшлі ў гульню «Арляня», разлічаную на навучэнцаў 10-11 класаў, і ў «Зарнічку» — для малодшых школьнікаў. Гэта ўзроставая пераемнасць ад адной гульні да іншай дазваляе нам ахапіць вялікую колькасць дзяцей цікавым заняткам. Іх трэба выхоўваць на перамогах, і ў нас гэта атрымліваецца.

Наталля ШАРАМЕЦЬЕВА, настаўніца гісторыі і кіраўнік Музея гонару і доблесці воінаў-інтэрнацыяналістаў праводзіць экскурсію.

Таццяна СІЎЦОВА. — У яго складзе ёсць сцягавая група, група ўскладання, група барабаншчыкаў, але ўсе ўдзельнікі ўзаемазамяняльныя. Кожны можа ўрачыста ўскласці вянок, іграць на барабанах ці ўдзельнічаць у плац-канцэрце. Гэта сур'ёзная калектыўная праца. Тут мае значэнне ўсё: і рэжысура нумароў, і харэаграфія, і страявая зладжанасць, сінхроннасць рухаў, складанасць элементаў, майстэрства барабаншчыкаў. Каб дабіцца той відовішчнасці, якую яны дэманструюць, навучэнцы трэніруюцца амаль штодня па дзве гадзіны. З імі працуюць два нашы педагогі-арганізатары, якія засвоілі новую для іх справу літаральна з нуля. Нам не трэба ўгаворваць дзяцей прыйсці ў атрад — заўсёды ёсць ахвотныя заняць месца таго, хто сышоў. Канешне, у адзінаццацікласнікаў застаецца менш часу на трэніроўкі, таму і з'яўляюцца «вакансіі».

— На ўсіх урачыстых мерапрыемствах тон задаюць барабаншчыцы парадна-цырыманіяльнага атрада, — дадае Марыя Кавалеўская. — Іх з'яўленне ўсе заўсёды чакаюць. Нас запрашаюць і на гарадскія мерапрыемствы, на дзень нараджэння Фрунзенскага раёна, запрасілі нават на фестываль аркестраў, які праходзіў на Трактарным заводзе... Увогуле, мы заўважылі, што, як толькі робім адзін крок, тут жа адкрываюцца магчымасці для наступнага: адкрылі цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі, уліліся ў ваенна-патрыятычныя гульні, стварылі парадна-цырыманіяльны атрад, а далей пачалі працаваць па адкрыцці ў гімназіі музеяў.

Профілі ў школьных музеяў бываюць розныя, мы ж вырашылі спыніцца на грамадзянска-патрыятычным, каб выхоўваць дзяцей на гераічным мінулым. У лютым 2014 года, да 25-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана, у нас урачыста адкрыўся Музей гонару і доблесці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Сёння ім кіруе **настаўнік гісторыі гімназіі Наталля ШАРАМЕЦЬЕВА.**

Дзяўчаты і хлопцы рыхтуюцца ў школьным ціры да ўдзелу ў ваенна-патрыятычнай гульні «Зарніца».

КРОК ЗА КРОКАМ

Яшчэ адзін прадмет гонару 43-й сталічнай гімназіі — парадна-цырыманіяльны атрад (своеасаблівая падлеткавая «рота ганаровай варты»), без выступлення якога не абыходзіцца ні адно ўрачыстае мерапрыемства ва ўстанове адукацыі. Ён неаднойчы перамагаў на гарадскіх конкурсах.

— Зараз у яго ўваходзіць каля 30 навучэнцаў. Калі раней мы бралі дзяцей ва ўзросце ад 12 гадоў і больш старэйшых, то цяпер у нас займаюцца і дзесяцігадовыя. Яны трэніруюцца, каб потым заняць месцы тых, хто пакіне атрад, — расказвае **намеснік дырэктара гімназіі па выхаваўчай рабоце Коблікавай.** Яна прысвечана яе сыну — стралку парашутна-дэсантнай роты вайсковай часці 35919.

14 красавіка 1985 года падраздзяленне дэсантнікаў трапіла ў акружэнне. Кола сціскалася, і выйсце заставалася толькі адно — прайсці праз мінаванае поле. Наперадзе ішоў гвардыі радавы Мікалай Коблікаў. Амаль дайшлі, калі раздаўся выбух. За мужнасць і гераізм ён быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Жыццё Мікалая, які загінуў у 19 гадоў, лягло ў аснову кнігі Мікалая Чаргінца «Сыны». Пахаваны Мікалай Коблікаў на Паўночных могілках у Мінску. Яго маці не аддала асабістыя рэчы сына ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а перадала іх у музей 43-й гімназіі. Перыядычна яна яго наведвае і карэктуе экспазіцыю, прысвечаную сыну.

Педагогі гімназіі ўпэўнены, што менавіта на такіх прыкладах асабістай мужнасці і гонару і трэба выхоўваць новае пакаленне. Асабістыя гісторыі вельмі кранаюць сучасных падлеткаў. Дарэчы, яны і самі з задавальненнем выступаюць у ролі экскурсаводаў і праводзяць экскурсіі на беларускай, рускай, англійскай і нямецкай мовах.

ДАРОГАМІ АФГАНІСТАНА

XX стагоддзе пакінула чалавецтву жорсткую памяць. Дзве сусветныя вайны, шэраг лакальных, шматлікія «гарачыя кропкі»... Нашы суайчыннікі выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Алжыры, Анголе, Афганістане, Бангладэш, Венгрыі, В'етнаме, Егіпце, Емене, Кітаі, Лаосе, Ліване, Мазамбіку, Паўночнай Карэі, Сірыі, Эфіопіі. Таму ў музеі ёсць карта свету, на якой пазначаны «гарачыя кропкі», дзе ваявалі ўраджэнцы Беларусі.

Дарогамі Афганістана прайшлі 28 832 беларусы. У ліку загінулых — 771 наш зямляк. Многія вярнуліся дадому інвалідамі. 12 чалавек зніклі без вестак.

— Экспазіцыя музея тэматычна падзелена на некалькі зон, — праводзіць для нас экскурсію Наталля Шарамецьева. — Гэта гісторыя Афганістана да ўводу савецкіх войскаў, першы этап вайны (снежань 1979 года — люты 1980-га) — штурм палаца Аміна, увод абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў на тэрыторыю Афганістана; другі этап (да красавіка 1985 года) — ажыццяўленне шырокамаштабных баявых аперацый; трэці этап (да снежня 1986 года) і гэтак далей. У раздзеле «Журботнае рэха Афганістана» размешчаны матэрыялы пра мінчан, якія загінулі падчас баявых дзеянняў у гэтай краіне.

Наш музей унікальны тым, што тут знаходзяцца толькі асабістыя рэчы, якія былі перададзены музею або самімі ўдзельнікамі афганскай вайны, або сваякамі воінаў, якія загінулі. Вольга Карасёва, напрыклад, прыехала ў Мінск з Віцебска, каб перадаць у музей асабістыя рэчы і фотаальбом свайго бацькі. Прызналася, што захоўваць іх дома — вельмі балюча. Давер, які яна нам аказала, для нас вельмі важны. А адна вітрына ў музеі знаходзіцца цалкам пад патранатам Алены Фёдараўны Аляксандра Суворава арганізавалі святочны збор яе жыхароў, прысвечаны 1 мая. Пра гэта стала вядома гітлераўцам. Раніцай у вёску ўварваліся карнікі. Яны сагналі ў дамы па 15—20 чалавек, расстрэльвалі іх з аўтаматаў, а дамы падпальвалі. Было спалена 96 двароў і забіта 382 жыхары. Таксама мы наведалі Колдычава ў Баранавіцкім раёне, дзе ў гады вайны дзейнічаў лагер смерці. А калі позна ўвечары вярнуліся дадому, то мае дзеці не пабеглі адпачываць, а палезлі ў інтэрнэт, каб знайсці больш інфармацыі пра ўбачанае. І вось у такой сітуацыі ты разумееш, што і час, і сілы аддадзены недарэмна.

У кабінеце грамадскіх арганізацый гімназіі сабрана цікавая калекцыя экспанатаў з мінулага піянерскай арганізацыі і савецкай школы.

ЗАНЯТАК ДЛЯ ДУШЫ

— Калі мы зрабілі першы музей і паглядзелі, як гістарычны матэрыял працуе на выхаванне, то зразумелі, якая ж гэта спрыяльная глеба, — канстатуе Марыя Кавалеўская, — і пачалі збіраць матэрыял для новага музея «Аб подзвігу вялікім і вечным», адкрыццё якога было прымеркаванае да 70-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яго апякуе **настаўніца матэматыкі Таццяна БУЛДАВА.**

Экспазіцыя музея ўключае элементы ваеннага абмундзіравання і экіпіроўкі часоў Вялікай Айчыннай вайны, узоры зброі, салдацкі пялявы кацялок, узнагароды, перададзеныя школе ў дар ветэранамі Фрунзенскага раёна, імітацыю вечнага агню. Большая частка экспанатаў была сабрана навучэнцамі школы — членамі атрада «Пошук». На стэндах — інфармацыя аб асноўных этапах і пераломных момантах вайны. Асноўная ўвага — падзеям і баявым дзеянням на беларускай зямлі. А самы цікавы аб'ект у музеі — макет танка Т-34 узору 1940 года, які быў створаны «Студыяй 25». Ёсць нават асобная тэма экскурсіі, прысвечаная гэтаму ўзору ваеннай тэхнікі: яе праводзіць васьмікласнік гімназіі, які вельмі глыбока паглыбіўся ў адпаведную тэматыку.

— У кожнага настаўніка, акрамя ўрокаў павінен быць занятак для душы, — кажа дырэктар нашай гімназіі. Для мяне гэта музей і пошукавы атрад, кастяк якога складаюць мае васьмікласнікі, у якіх я з'яўляюся класным кіраўніком, — канстатуе Таццяна Булдава. — Настаўнікі гімназіі, якія родам не з Мінска, часта запрашаюць нас на сваю малую радзіму. Мы вандруем па месцах баявой славы і па месцах трагічных падзей ваенных часоў на беларускай зямлі. На вясенніх канікулах ездзілі ў Застарынне, што ў Баранавіцкім раёне. Гэта вёска — малодшая сястра Хатыні. Уначы 2 мая 1943 года партызаны атрада імя

Сёння ў гімназіі вядзецца збор экспанатаў ужо для трэцяга музея, які будзе прысвечаны гісторыі камсамола.

— Гэта для нас з вамі камсамол — наша маладосць, а для сучасных дзяцей — далёкая гісторыя, — усміхаецца дырэктар гімназіі. — Мяркуем, што і гэтая старонка з мінулага будзе для іх цікавая.

Таксама навучэнцы 43-й гімназіі далучыліся да праекта па стварэнні віртуальнай гісторыі лагера ваеннапалонных «Шталаг 352» у Масюкоўшчыне. Геаграфічна гімназія знаходзіцца недалёка ад месца, дзе ён размяшчаўся. Праект рэалізоўваецца пры падтрымцы Фонду «Памяць, адказнасць і будучыня». Цяпер і гімназісты будуць уносіць свой уклад у аднаўленне лёсаў вязняў канцлагера...

Парадна-цырыманіяльны атрад 43-й мінскай гімназіі — неаднаразовы пераможца конкурсаў самага рознага ўзроўню.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 58 (584)

НЯЛЁГКІ ШЛЯХ ПАЭТА

«Чытаем» Купалу разам

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася прэзентацыя новага выставачнага праекта «За шчасця лепшага вясну...», прымеркаванага да Дня Перамогі і прысвечанага жыццю і творчасці Янкі Купалы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Куратар выставы — вядучы навуковы супрацоўнік музея Галіна Варонава, якая спецыялізуецца на жыцці і творчасці паэта ў перыяд 1930—1940-х гадоў.

Аб адметнасцях выставы «Звязде» распавяла супрацоўніца музея Марыля Барткова:

— Пад праект «За шчасця лепшага вясну...» падабраны шэраг цудам ацалелых памятак з 1941 да 1943 года. Можна ўбачыць сведчанні творчай дзейнасці народнага паэта Беларусі ў апошнія гады жыцця: рукапісы вершаў і публіцыстыку першых месяцаў вайны. Самыя каштоўныя рэчы ў экспазіцыі — тыя, якімі Янка Купала карыстаўся падчас эвакуацыі. Фотаздымкі і лісты распавядаюць пра доўгі шлях: паэту давялося праехаць Маскву, Чабаксары — да пасёлка Пячышчы, што ў Татарстане...

У выставачным праекце прадстаўлены ўнікальныя меморыі, напрыклад, гадзіннік фірмы «Звязда», які належаў пляменніцы Купалы Ніне Раманоўскай, ваеннаму хірургу. Яна зберагла падарунак дзядзькі, атрыманы з нагоды заканчэння Беларускага медыцынскага інстытута.

Прэзентацыя выставы «За шчасця лепшага вясну...» адбываецца ў рамках праекта музея «Купала. 12 адкрыццяў», які прысвечаны 140-годдзю Песняра і ажыццяўляецца на працягу юбілейнага года. Супрацоўнікі музея ў розных фарматах прадстаўляюць малавядомыя моманты з жыцця Янкі Купалы, паказваючы вынік працы:

— Кожны распавядае пра свайго Купалу: што найбольш падабаецца ў творчасці, чым захапляе яго асоба, пра новыя звесткі пра паэта, у выяўленні якіх дапамаглі архівы Беларусі. Рэалізоўваецца гэты праект у апошні чацвер кожнага месяца, — адзначыла Марыля Барткова.

На выставе, якая распавядае аб адным з самых трагічных этапаў з жыцця паэта, прадстаўлены і мастацкія работы. Сярод іх — апошні прыжыццёвы партрэт Янкі Купалы, створаны графікам Ісакам Давідовічам у 1941 годзе.

Наведвальнікі змогуць прыняць удзел у грамадска-культурнай акцыі «Чытаем Купалу разам», падчас якой прагучаць патрыятычныя вершы Янкі Купалы. Пазнаёміцца з выставай можна да 10 мая.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота Аркадзя БУЛВЫ.

Прэм'ера

ЧАС ЖЫЦЬ! ...БЕЗ ШКАДАВАННЯ АБ МІНУЛЫМ

На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы нядаўна адбылася прэм'ера — паказ спектакля «Час жыцця». Рэжысёрам пастаноўкі выступіў Ігар Малаў, а ў акцёрскім складзе зноў маем магчымасць бачыць народнага артыста СССР і БССР Генадзя Аўсяннікава, народную артыстку Беларусі Зінаіду Зубкову, заслужанага артыста Уладзіміра Рагаўцова і маладое пакаленне талентаў Міхаіла Світу, Святлану Гулевіч і іншых. «Звычайная гісторыя» — так вызначаны жанр спектакля на афішы, але пасля прагляду разумееш, што менш за ўсё хочацца, каб убачанае было звыклай з'явай...

Дзеянне спектакля пачынаецца ў кватэры пажылога ліфцёра Францішка Абеля, якую той дзеліць з унукам Паўлам. Там мужчына збіраецца з сябрамі кожную пятніцу, не толькі каб успомніць сваю маладосць, але і спяваць, танцаваць, дарыць адно аднаму выдатныя эмоцыі. І нічога, здавалася б, трагічнага, калі б не ўсведамленне, што жывуць сябры Абеля ў доме для састарэлых... Тэма сувязі пакаленняў, адказнасці чалавека перад продкамі і нашчадкамі ідзе скразной ніткай. Калі назіраеш за персанажамі старэйшага пакалення, то губляецца ўспрыманне хуткаплыннасці часу. Яны ж мараць, спрачаюцца, адзначаюць святы і нават не думаюць, быццам жыццё скончыцца заўтра.

У адрозненне ад таго, як ацэньваюць іх існаванне прадстаўнікі маладзейшага пакалення, унук гаспадара і яго нявеста. Юная пара закаханых — прагматычныя і эгаістычныя — цалкам засяроджана на марах аб уласнай будучыні. Маўляў, вось будзе ў нас сям'я, сваё жыллё, дзеці, і ўсё стане добра. А пакуль трэба прыдумаць, як прыспешыць той светлы заўтрашні дзень. Іх не цікавіць цана і шлях дасягнення ўласнага камфорту, няхай гэта адбудзецца за кошт дабрабыту старых, бо колькі ўжо трэба тым людзям, якія дажываюць свой век... Старыя ўвогуле здаюцца моладзі дзівакамі, з якімі і лічыцца не варта. Тут і з'яўляюцца ноткі расчаравання, калі пачынаеш думаць: няўжо маладое пакаленне і сапраўды настолькі ачарсцвела душой і не цэніць нічога, акрамя матэрыяльных выгод? ...Што там прыгажосць рарытэтнага гадзінніка, калі можна яго прадаць за вялікія грошы? Як гэта збіраць уласныя чаявыя ўсё жыццё, каб набыць букет на дзень нараджэння сяброўцы? Думаю, не толькі героі п'есы, але і кожны, хто паглядзіць спектакль, будзе задавацца бясконцым шэрагам уласных пытанняў і шукаць на іх адказы... А ў выніку мы зразумеем, што няма лепшага часу, каб жыць, цаніць і здзяйсняць задуманае, чым тут і цяпер.

«Час жыцця» — менавіта такую назву выбралі для спектакля. Але ў арыгінале п'еса славацкага драматурга Освальда Загрэдніка мае назву «Сола для гадзінніка з боем». Твор убачыў свет амаль паўстагоддзя таму — у 1973 годзе. І Алег Яфрэмаў тады ж пачаў работу над пастаноўкай п'есы ў Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры, прэм'ера якой адбылася напрыканцы года, а ў 1974 годзе пастаноўку запісалі для тэлебачання. На беларускай сцэне спектакль набыў новае жыццё дзякуючы Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы і перакладу п'есы, здзейсненым **журналісткай і пісьменніцай Тамарай ВЯЦКАЙ**.

— На жаль, я пазнаёмілася з гэтай кранальнай п'есай толькі тады, калі атрымала прапанову ад тэатра на пераклад. Дагэтуль не глядзела, не ведала, не чытала. Але вось яна ў мяне — і, як гаворыцца, «да слёз». Тэма блізкая, зразумелая, таму што традыцыйна адносіны бацькоў і дзяцей на паверхні. Ідэя перакладу не мая, але разуменне неабходнасці гэтага спектакля

на нашай сцэне не выклікае сумненняў. Таму пачала перакладаць адразу, і праца была, шчыра скажу, не з лёгкіх. Не ведаю, як працуюць іншыя перакладчыкі, але мне ўвогуле падалося, што лягчэй самой напісаць мастацкі твор, чым перакладаць чужыя словы, чужыя вобразы і выразы, чужыя эмоцыі... Іншы раз пошук патрэбнага гучання слова займаў шмат часу. Напрыклад, беларускага адпаведніка паняццю «чаявыя» я так і не знайшла, каюся. Дарэчы, слоўнік прапануе менавіта кальку, мне не падабаецца аніяк, але, што зробіш, так гэтыя «чаявыя» ў тэксце і засталіся, — дзеліцца Тамара Рыгораўна. — Перакладала твор амаль два месяцы. Паколькі гэта мой першы пераклад для Купалаўскага, то асабіста было важна зрабіць яго зразумелым і для трупы, і для гледачоў. Шмат часу мы разам думалі над назвай, былі розныя варыянты, але сышліся ў меркаванні, што «Час жыцця» найлепш перадае сэнс п'есы... На прэм'еру я купіла білеты не толькі сабе, а яшчэ дачцэ і ўнучкам. І бясконца кідала на іх вокам: ці падабаецца. А потым супакоілася, таму што п'еса пра тое, што многім баліць, і акцёры цудоўныя, яны быццам расказвалі пра сваё жыццё, і гэтыя словы ўжо былі іхнімі — і не Загрэдніка, і тым больш не маімі... Дзякуй тэатру за мой новы вопыт і новы кірунак у жыцці.

На падрыхтоўку новага спектакля «Час жыцця» трупе Купалаўскага тэатра спатрэбілася больш за чатыры месяцы. Рэжысёр Ігар Малаў у гэтай пастаноўцы вывеў на сцэну не толькі заслужаных і народных артыстаў, але і маладых акцёраў, якія адносна нядаўна сталі часткай калектыву. У кожнага героя тут свая гісторыя, свае радасці і ўспаміны, а самае галоўнае — прага жыць.

— Для мяне роля Пані Конці — падарунак, пра які я даўно марыла. Мая гераіня лёгкая, жыццярадасная і мае вялікую любоў да сваёй кампаніі сяброў, — дзеліцца **актрыса, народная артыстка Беларусі Зінаіда ЗУБКОВА**. — Калі б усе людзі былі такія, як Пані Конці! У ёй жа столькі дабра і святла. Яна любіць і любімая, і яе жыццё, напэўна, было вельмі цікавым, хоць у творы нідзе няма канкрэтыкі адносна таго, дзе і кім гэтая жанчына працавала, ці існаваў яе сын... Галоўнае, што, нават апынуўшыся ў прытулку для пажылых людзей, яна засталася з добрым сэрцам. І ўвогуле, уся кампанія герояў — гэта людзі хоць і адзінокія, але яны аддаюць даніну маладосці ўменнем радавацца жыццю, нягледзячы на ўзрост і абставіны. «Час жыцця» — гісторыя пра тое, што трэба пражыць свае гады так, каб не шкадаваць аб мінулым.

...Бой старадаўняга гадзінніка на сцэне падчас спектакля — не толькі сімвал, але і напамін як маладым, так і дарослым: пакуль жывеш і дыхаеш, то кожная хвіліна дарагая. А чым будзе напоўнены час і якія пакіне ўспаміны — гэта ў многім залежыць ад самога чалавека. Бо калі мы пражываем дзень за днём у роздумах, суме і сумненнях, то так усё і складваецца ў выніку. Але варта заўважыць, як грэе сонца і колькі добрага ў людзях, тады падобнае і прыцягнецца ў адказ. А праблема непаразумення пакаленняў існавала і не знікне, мабыць, ніколі. Толькі пражываючы вопыт узросту, калі хочацца свабоды, лепшага жыцця і здаецца, быццам усё сам без падказак ведаеш, можна па-сапраўднаму пасталець. І ўсвядоміць цану ўласных памылак. Ці ўсё ж лепш рабіць высновы на адлегласці?

Алена ДРАПКО.
Фота прэс-службы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Вернісаж

ГАРМОНІЯ МАСТАКА-ФІЛОСАФА

У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава Уладзіміра Савіча

У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася персанальная выстава вядомага мастака Уладзіміра Савіча, прымеркаваная да яго 70-годдзя. Кожны з сарака твораў, прадстаўленых у экспазіцыі, патрабуе шматузроўневага ўспрымання... Гульня фарбамі, сэнсамі, фактурай, сінтэз паэзіі, жывапісу і графікі... Архетыпы, пазнавальныя сімвалы і складаныя алюзіі... Узнёслыя і трагічныя твары анёлаў, абрысы храмаў, беларускія краявіды... «Гэта выпакутаваная гармонія мастака-філосафа, праекцыя створанага свету, у якім роля чалавека ўжо рашуча пераўзыходзіць па аб'ёме тое, што было створана да яго і, магчыма, для яго прыродай і Богам» — гаворыцца ў анатацыі да выставы.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833 225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 11 мая 2022 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.09.2021 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 06 мая 2022 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Лови удачу 2»

1. Общество с ограниченной ответственностью «Триовист», Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й эт., УНП 190806803.
2. Наименование рекламной игры «Лови удачу 2».
3. Срок начала рекламной игры: 09.02.2022.
Срок окончания рекламной игры (включая период розыгрыша и выдачи призов): 27.05.2022.
4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4149, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь от 04.02.22.
5. Сведения о количестве участников рекламной игры: 65 495 человек.
6. Сведения о розыгрыше призового фонда: Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.
7. Фамилии, инициалы победителей и их выигрыши размещены на сайте: www.21vek.by (ссылка https://www.21vek.by/company/news/6884.html)
8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 29 3-021-021.

УНП 600045674

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества ЗАО «ДОРОЖНАЯ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННАЯ ПЕРЕДВИЖНАЯ МЕХАНИЗИРОВАННАЯ КОЛОННА № 94» (УНП 600045674), объявляет о проведении **18.05.2022 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки bankrottorg.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Продавец: Открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-51709, площадью 1500,00 кв. м, наименование – котельная, назначение – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4/5, составные части и принадлежности: пристройка, расположено на земельном участке с кадастровым № 240100000001000497 площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

Нач. цена: 45 720,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 4 572,00 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 31.05.2022 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 04.05.2022 с 08.30 по 30.05.2022 до 17.30.

Ранее опубликованные извещения: газета «Республика» 26.11.2021 № 227, газета «Республика 15.02.2022 № 29.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» №BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Условия повторного аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участником документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона (расходы Доверителя на проведение независимой оценки – 322,70 бел. руб. с НДС 20 %, на проведение экспертизы независимой внутренней оценки – 440,23 бел. руб. с НДС 20 %), заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в течение 10 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. **Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «ВПЗ» от 28.04.2022.**

Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Доп. информацию можно получить по тел.: **(0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, **+375 (33) 317 50 00.**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **РУП «БЕЛПОЧТА»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения

Лот № 1:

Грузовой специальный фургон изотермический MAZ 5340B5 8425-013 KUPAVA 573100,

кузов (рама) № Y3H573100E0066873 / Y3M5340B5D0000386, 2013 г.в.

Местонахождение: г. Минск, ул. Лукьяновича, 6.

Начальная цена с НДС – 11 004,53 руб.

Аукцион состоится **20.05.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі



РЭКТАР-НАСТАЎНІК

У 1990 годзе Міністэрствам народнай адукацыі БССР для навукова-практычнай рэалізацыі ідэй прынцыпаў бесперапыннай адукацыі было прапанавана на базе нашага інстытута стварыць навуковы комплекс, уключыўшы ў яго абласное ўпраўленне адукацыі, інстытут павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, Магілёўскае педагагічнае вучылішча, некалькі гімназій, гарадскіх і сельскіх школ. Для каардынацыі адпаведных навуковых даследаванняў і рэальнай працы гэтага комплексу выдзялялася стаўка прарэктара па вучэбнай рабоце. Сакратаром партбюро гэты час працаваў фізік-тэарэтык С. М. Чарноў. Мы з ім сябравалі, і ён мне расказаў, што менавіта ён настойваў на маёй кандыдатуры, рэктар прапанаваў даручыць гэту работу дацэнту Н. У. Седж. Надзея Уладзіміраўна стаяла каля вытокаў стварэння факультэта дашкольнага выхавання, валодала ўнікальнымі арганізатарскімі здольнасцямі і, з пункту гледжання Кудрашова, магла б справіцца з пастаўленай міністэрствам задачай. Прапаноўваючы мне пасаду прарэктара, Яўген Паўлавіч пра другія магчымыя кандыдатуры не гаварыў, ён толькі ў агульных рысах ахарактарызаваў тую працу, якая была наперадзе. Падкрэсліў пры гэтым, што справа нас чакае новая. І што ад мяне перш за ўсё патрабуюцца ініцыятыва і творчы падыход. Прызнацца, я не адразу пагадзіўся. Да гэтага часу ў мяне ўжо быў шасцігадовы вопыт намеснікам дэкана фізіка-матэматычнага факультэта і два гады загадвання кафедрай алгебры і геаметрыі. Навуковая і вучэбная праца на кафедры мяне захапіла. Разам з калегамі мы напісалі некалькі вучэбных дапаможнікаў па алгебры і тэорыі лічбаў, сталі пазнавальнымі сярод калег-матэматыкаў іншых ВНУ. У мяне ўжо нарадзілася доктарская дысертацыя. А тут — адміністрацыйная праца, ды яшчэ пад даволі жорсткім кіраўніцтвам рэктара Кудрашова. І потым, калі б гэта была традыцыйная праца прарэктара па вучэбнай рабоце, які адказваў у інстытуце за вучэбны парцэс, ці зразумелая ўсім пасада прарэктара па навуковай працы. А ў дадзеным выпадку — кіраўніцтва вучэбным комплексам, які давядзецца яшчэ ствараць! Кудрашоў нават кабінет мне не выдзеліў. Я працягваў туліцца на нашай кафедры і толькі раздражняў калег. Не толькі сваёй прысутнасцю, але і велізарнай колькасцю наведвальнікаў да новага прарэктара. Але менавіта гэтая сітуацыя і зблізіла нас з Яўгенам Паўлавічам. Я атрымаў магчымасць непасрэдна назіраць, вывучаць і аналізаваць працу рэктара.

Для функцыянавання вучэбнага комплексу патрабавался прапісаць Палажэнне аб яго рабоце, стварыць кіраўніцкую вертыкаль, выкрышталізаваць дзеля гэтага з усёй абласной сістэмы адукацыі людзей, якія творча мысляць. І яшчэ вырашыць няпростыя фінансавыя пытанні. Мне даводзілася выступаць па гэтых праблемах на Савеце інстытута, на рэктарадзе і, безумоўна, рэгулярна і даволі часта дакладваць па іх рэктару. Ён прымаў мяне строга, пытаўся патрабавальна, мне здавалася, што нават асалоду атрымліваў з-за маёй нявопытнасці і слабай падрыхтоўкі перад паходам да яго. Я сваім сябрам гаварыў, што, вобразна кажучы, калі заходжу ў кабінет да Кудрашова, то ён дастае востра заточаную піку і пачынае калоць у неабароненыя месцы. Балюча калоць, і, калі я не вытрымліваю гэтай экзекуцыі і сыходжу, нічога ад яго не здолеўшы дамагчыся, ён шчыра радуецца. І я навучыўся абараняцца: грунтоўна рыхтаваўся, прадумваў свае варыянты рашэння праблем, прадбачыў пярэчанні рэктара, такім чынам апранаў кальчугу, латы, браў з сабою шчыт і тым самым сыходзіў ад пікі Кудрашова. І ён гэта зразумеў! Нашы размовы сталі дзелавымі, канструктыўнымі. І я нават адчуў пэўную добразычлівасць. З часам заўважыў, што Яўген Паўлавіч усё болей насцярожана ставіцца да ўсялякіх перамен і навацый. Напрыклад, заходжу да яго і прапаноўваю ў рамках вучэбнага комплексу адкрыць пры інстытуце ліцэй для распрацоўкі тэхналогій навучання таленавітых дзяцей. Прыношу з сабою падрыхтаваныя дакументы — Палажэнне аб ліцэі, сістэму фінансавання, прапановы па складзе выкладчыкаў. Справа для пединстытута абсалютна новая, рызыкоўная — ці мала куды нас могуць вывесці гэтыя навацыі! Спрабуючы ўнікнуць у сутнасць маіх прапаноў, дэталёва разглядваючы змест прадстаўленых дакументаў, Яўген Паўлавіч так шчыра і пытаецца:

— Радзькоў, навошта табе гэта трэба?

Я адказваю:

— Гэта, Яўген Паўлавіч, не мне трэба. Жыццё ўжо патрабуе такіх рашэнняў і дзеянняў.

Вучэбны комплекс у нас атрымаўся. Рэзультаты яго работы аказаліся запатрабаванымі не толькі ў Беларусі. З навуковымі дакладамі аб прынцыпах рэалізацыі бесперапыннай адукацыі ва ўмовах вучэбнага комплексу на базе пединстытута мы выступалі на ўсесаюзных канферэнцыях па гэтай тэматыцы ў Маскве, Растове, Ташкенце. І ў сябе часта прымалі калег, каб абмяняцца навуковымі і практычнымі распрацоўкамі ў галіне разіцця сістэмы адукацыі. Пра стварэнне вучэбнага комплексу і вынікі яго работы рэктар дакладваў на калегіі Міністэрства народнай адукацыі і атрымаў высокую ацэнку сваёй дзейнасці ў гэтым кірунку. Мы яму для калегіі рыхтавалі ўсе матэрыялы, але дакладваў ён сам. Мяне з сабою ў міністэрства не ўзяў, але я лічу, што гэта і правільна. Рэктару ж даручалі гэтую справу, ён асабіста адказваў за яе выкананне. Усё ў звыклым для яго стылі кантраляваў і ўвогуле валодаў неабходнай па гэтым пытанні інфармацыяй, таму і справаздачу трымаў сам. На тое і рэктар!

Назіраў я і за метадамі падбору і расстаноўкі кадраў, якім кіраваўся Кудрашоў. Зразумела, што ён уважліва назіраў за працай сваіх падначаленых, ацэньваў вынікі іх навуковай, педагагічнай, адміністрацыйнай дзейнасці. У інстытуце хадзілі размовы, што ў Магілёўскай шко́ле КДБ ён выкладаў формы і метады работы з людзьмі, гэта значыць, меў у гэтай справе і тэарэтычную падрыхтоўку. Напрыклад, я заўважыў, што на ключавыя ў інстытуце пасады прарэктараў, дэканаў, загадчыкаў кафедр Яўген Паўлавіч імкнуўся прызначаць перш за ўсё тых выкладчыкаў, якія справіліся з абавязкамі адказнага сакратара прыёмнай камісіі. Я таксама гэта прайшоў і асмельваюся запэўніць, што па тым часе праца адказнага сакратара была ў інстытуце самай цяжкай — і фізічна, і маральна. Нават небяспечнай! Мала таго, што трэба было арганізаваць прыём уступных экзаменаў, але і неяк адбіцца ад просьбаў родзічаў, сяброў, начальнікаў. А не заўсёды і адаб'ешся! Не дапусціць уцечкі экзаменацыйных матэрыялаў, не захлынуцца ў апеляцыях, папярэдзіць выкладчыкаў пра наступствы хабару ва ўсіх яго праявах. За ўсё гэта асабіста адказвае рэктар, але на перадавой гэтага фронту камандуе адказны сакратар. Кудрашоў прыглядаў кандыдатуру і кідаў яе ў бой. Падтрымліваў, несумненна, дапамагаў, але ў агуле, а д'ябал жа хаваецца ў дробязях! І калі чалавек вытрымліваў гэты цяжар, рэктар стараўся прасунуць яго і па асноўнай службе. Вось такі вопыт работы з людзьмі я таксама назіраў і рабіў для сябе адпаведныя высновы.

З часам мы адчулі, што Яўген Паўлавіч пачаў губляць былую хватку. Гэта і зразумела. Дваццаць пяць гадоў рэктарскай працы дарэмна не праходзяць. Ды і выпала на яго долю нямала выпрабаванняў. Пачынаў сказвацца і ўзрост. Думаю, што сам гэта разумеў і пачаў задумвацца пра свой сыход з пасады, пра пераемніка. Адкрытых размоў на гэтую тэму ён не вёў, але я, напрыклад, асабіста адчуў такі яго настрой. Ён пачаў заходзіць да мяне ў кабінет, выказваць некаторыя ацэнкі паводзін нашых калег. Як правіла, я быў з ім згодзен. Людзей Яўген Паўлавіч адчуваў і ведаў. З часам нашы размовы сталі болей шчырыя. Здаралася, праходзілі яны і ў нефармальных абставінах. У такіх выпадках Кудрашоў тэлефанаваў мне раніцай, цікавіўся маім графікам і прапаноўваў у канцы рабочага дня праверыць стан нашай загараднай вучэбнай базы «Любуж» у Магілёўскім раёне. Тады ў абед я стараўся дома добра паесці, таму што размова чакалася з выпіўкай, а дозу спіртнога Яўген Паўлавіч трымаць умеў. Выязджалі мы ў невялікі пералесак пад Магілёвам, вадзіцель Валодзя Трыфаненка на капоце службовай «Волгі» накрываў даволі аскетычны стол, а сам сыходзіў пагуляць па лесе. Пілі мы заўсёды толькі гарэлку. Нямала, але ніколі кантроль над сабою не гублялі. Ды і не для выпіўкі мяне рэктар запрашаў. Гаварылі пра справы. І ў развіцці інстытута, і пра людзей, і пра палітыку. Мне цяжка сказаць, наколькі я быў цікавы Кудрашову, але я не толькі ўважліва яго слухаў — я ўнікаў у яго развагі, я вучыўся.

У 1994 годзе мы ўпершыню ў гісторыі выбралі Прэзідэнта. Ім стаў выпускнік гістарычнага факультэта нашага інстытута Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Сталі перафарміравацца органы ўлады, выбудоўвацца адміністрацыйная вертыкаль. Для гэтага патрабаваліся новыя людзі, у тым ліку і для кіраўніцтва прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі. У інстытуце пайшлі размовы, што па ўзросце сыходзіць з рэктарскай пасады і Яўген Паўлавіч Кудрашоў. Ён таксама прадбачыў свой сыход, у мяне з ім на гэтую тэму адбылася шчырая размова, але свайго пераемніка ў ёй Яўген Паўлавіч відавочна не вызначыў. Я тады падумаў, што ён усё ж спадзяецца яшчэ нейкі час папрацаваць на сваёй пасадзе. Але працэс змены кіраўніка інстытута ўжо пайшоў. Мяне запрасіў да сябе першы прарэктар М. А. Аўласевіч і шчыра паведаміў, што, па яго звестках, адстаўка Кудрашова — пытанне вырашанае. На пасаду рэктара разглядаюцца дзве кандыдатуры — яго і мая. Мяне пры гэтым скарыла шчырасць Міхаіла Аляксандравіча ў ацэнцы нашых з ім перспектыў. Ён сказаў:

— На мой погляд, шанцы стаць рэктарам у нас з табой аднолькавыя і не моцна ад нас залежаць. Таму давай адразу дамовімся: я стану рэктарам — ты мне будзеш дапамагаць, ты — я табе дапамагу.

Не буду хаваць, да гэтай размовы я быў гатовы. Мой сват Генадзь Цімафеевіч Ігнаценка, найвопытнейшы партыйны работнік, тады старшыня Магілёўскага абласнога савета дэпутатаў, мяне папярэдзіў, што, на крайні выпадак, на абласным узроўні гэтае пытанне вырашана на карысць Аўласевіча. У мяне ў гэты час у самым разгары была праца над доктарскай дысертацыяй. Я разумеў, што, стаўшы рэктарам, мне будзе цяжка яе завяршыць, давядзецца цалкам паглыбіцца ў няпростыя адміністрацыйныя абавязкі. І — галоўнае! На той час я ўжо разумеў, што на працы чалавек праводзіць трэцюю частку свайго жыцця, таму там ён павінен сябе адчуваць камфортна. І такая абстаноўка ў калектыве залежыць перш за ўсё ад кіраўніка. У такім выпадку і аддачу ад людзей ён атрымае максімальную. Аўласевіч дваццаць тры гады чакаў гэтую пасаду, відавочна, што прыйшоў яго час. І я зусім шчыра сказаў, што буду яму ва ўсім дапамагаць.

На гэтым справа не завяршылася. Прэзідэнт А. Р. Лукашэнка запрасіў да сябе на гутарку для кансультацый па гістарычных пытаннях Я. І. Трашчанка, якога са студэнцкіх гадоў паважаў як сумленнага чалавека і прынцыповага вучонага. Я з Якавам Іванавічам сябраваў. Таму, вярнуўшыся з Мінска, ён зайшоў да мяне і сказаў, што сапраўды Кудрашоў сыходзіць у адстаўку і на 99 працэнтаў вырашана: я буду наступным рэктарам. Пры гэтым ён, робячы таемны выгляд, не стаў тлумачыць, кім вырашана, хто гэта сказаў, чаму на 99 працэнтаў. У інстытуце ўсё ішло сваім парадкам, і размовы пра змену рэктара нават прыціхлі. І раптам да нас у інстытут нечакана прыязджае начальнік упраўлення кадравай палітыкі Міністэрства адукацыі А. А. Пыжоў. Ён вечарам сустрэўся з Кудрашовым. Пра што яны гаварылі, мы не ведалі, пра мэту яго прыезду нічога нам не расказаў і Яўген Паўлавіч. Ён толькі позна ўвечары абвясціў на 9 раніцы пасяджэнне рэктарата. Парадак яго не сказаў. Раніцай усе члены рэктарата былі напружаны, але ніякіх размоў паміж сабою не вялі. Ды і пра што было гаварыць, калі мы нічога не ведалі.

Пасяджэнне рэктарата адкрыў Яўген Паўлавіч, даволі спакойна абвясціў, што на парадку дня адно пытанне. Кадравае. Аб прызначэнні новага рэктара інстытута. І прадставіў слова Пыжову. Аляксандр Аляксандравіч сказаў, што міністрам прынята рашэнне аб адстаўцы Яўгена Паўлавіча Кудрашова і прызначэнні новага рэктара. Ад імя міністра падзякаваў Яўгену Паўлавічу за плённую працу і папрасіў яго выказаць свае прапановы па кандыдатуры новага рэктара. Напружанне ў кабінеце стала гранічным. Усе цяпер зразумелі, пра што вечарам гаварылі Пыжоў і Кудрашоў, але рэзультатаў гэтай сустрэчы не ведаў ніхто з астатніх прысутных. Кудрашоў адразу, без усялякіх разваг і тлумачэнняў, назваў сваім пераемнікам прафесара Аўласевіча. Павісла цяжкая паўза. Усе разумелі непазбежнасць змены рэктара, але ніхто не быў гатовы да гэтага неспадзяванага рашэння. Прарэктар па гаспадарчай частцы Анатоль Васільевіч Курбан вялікім пальцам упёрся мне ў спіну і позіркам стаў пытацца, ці прапаноўваць яму маю кандыдатуру. З такім жа маўклівым пытаннем прама глядзеў на мяне прарэктар па рабоце са студэнтамі завочнага навучання Іван Іванавіч Мартынаў. Прарэктар па навуковай рабоце М. В. Машчанка, прарэктар па выхаваўчай рабоце В. І. Папоў, як і ўсе астатнія члены рэктарата, проста сядзелі ў напружанні. Але ж мы з Аўласевічам абодва зараней дамовіліся, і, каб не падстаўляць пад удар сваіх сяброў-калег, я папрасіў слова і падтрымаў кандыдатуру Міхаіла Аляксандравіча.

Адносіны паміж новым і ранейшым рэктарам не склаліся, хоць яны разам працавалі ў рэктараце болей як дваццаць гадоў. Адкрыта, на людзях, гэта не выяўлялася, але нам часта даводзілася выслухоўваць іх крыўды адзін на аднаго. Мы ж з Яўгенам Паўлавічам працягвалі сустракацца, шчыра размаўлялі, і ўжо пасля прызначэння рэктарам мяне ў нас засталіся такія ж паважлівыя, сяброўскія адносіны. Мая наступная работа з рэктарамі дазволіла заўважыць адну заканамернасць, якую я ўбачыў на прыкладзе Кудрашова. Ва ўсіх рэктараў складваліся напружаныя адносіны са сваімі пераемнікамі. Нават калі яны самі іх рыхтавалі і рэкамендавалі на гэтую пасаду. А вось ужо з рэктарам праз аднаго стасункі былі прыкметна лепшыя. Як і ў мяне і з Яўгенам Паўлавічам.

Пасля майго прызначэння міністрам адукацыі мы з Кудрашовым бачыліся рэдка. Але ён пастаянна тэлефанаваў і ацэньваў маю дзейнасць, даваў парады. Ён працягваў заставацца маім рэктарам-настаўнікам...

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Працяг будзе 7 мая.

Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка, 2, 9, 16 і 23 красавіка.

БЛУКАННЕ ПА СТРАТАХ

Да чаго еўрапейскія санкцыі прывялі Польшчу?

Разрыў кантрактаў, страта тысяч працоўных месцаў, рынкаў збыту і ў канчатковым выніку банкруцтва. Усё гэта пагражае польскім кампаніям, якія пацярпелі ад нядаўніх санкцый ЕС і дзеянняў Беларусі ў адказ, што забараніла ўезд у сваю краіну еўрапейскім грузавікам, адзначыў партал навін Onet.pl. Еўрасаюз наклаў забарону на грузаперавозкі аўтатранспартам, зарэгістраваным у Беларусі і Расіі. Такое рашэнне было прынята на фоне канфлікту ва Украіне, а таксама пад ціскам крытыкі з боку ўкраінцаў. Раней перад тэрміналам у Карошчыне (Любускае ваяводства) побач з польска-беларускім пагранічным пераходам украінцы ладзілі пратэсты і блакады, патрабуючы поўнага закрыцця гандлю з Беларуссю і Расіяй. Аднак уведзеныя Еўрасаюзам санкцыі спрацавалі супраць польскіх кампаній. Да чаго прывялі абмежаванні?

НА МЯЖЫ БАНКРУЦТВА

Напрыканцы сакавіка мытныя брокеры накіравалі ўраду Польшчы ліст з просьбай прыняць захады, якія маглі б кампенсаваць страты мытнай галіны ў сувязі з еўрапейскімі санкцыямі. У лісце гаворыцца, што санкцыі ЕС, уведзеныя ў пачатку сакавіка, прывялі да скарачэння гандлю таварамі, якія імпартуюцца з Расіі і Беларусі, прыкладна на 90 працэнтаў. У выніку мытныя брокеры аказаліся на мяжы банкруцтва. 4 чэрвеня заканчваецца пераходны перыяд для рэалізацыі заключаных кантрактаў, пасля чаго гандаль поўнасцю спыніцца. «У выніку большасць мытных арганізацый страціць сваю фінансавую ліквіднасць і будзе вымушана згарнуць дзейнасць», — гаворыцца ў лісце. Зварот брокераў быў накіраваны прэм'ер-міністру Польшчы Матэвушу Маравецкаму, міністру развіцця і тэхналогій Пятру Новаку, упаўнаважанаму па справах малога і сярэдняга бізнесу Адаму Абрамовічу і ваяводзе Любускага ваяводства Уладзіславу Дайчаку. Адказ прыйшоў толькі з Міністэрства развіцця і тэхналогій. Але, паводле слоў кіраўніка Польскай палаты мытні, лагістыкі і экспедытавання Пятра Голдына, атрыманы адказ «не мае нічога агульнага з бягучай сітуацыяй і ніякім чынам не звязаны з праблемамі галіны». Астатнія адрасаты, уключаючы прэм'ера Матэвуша Маравецкага, не адказалі на запыты прадпрымальнікаў дагэтуль.

Тавары з Расіі і Беларусі ў любым выпадку будуць паступаць у ЕС, але на грузавіках, зарэгістраваных у краінах, якія не трапляюць пад санкцыі, пераканана кіруючы дырэктар мытнага агенцтва Terminus Group з Беластока Эвеліна Грыгатовіч-Шумоўская. «Цяпер Эльдарада пачнецца для грузавікоў з Казахстана, Узбекістана, Азербайджана, Пакістана, Турцыі, Сербіі, Чарнагорыі, Малдовы і, вядома, Украіны», — заўважыла яна.

Для польскіх прадпрымальнікаў сітуацыя іншая. «Усім, хто звязаны з усходняй мяжой, пагражае банкруцтва. Страты завоблачныя, таму што акрамя разрыву шматгадовых дагавораў аб супрацоўніцтве паміж галінамі людзі ўнеслі вялізныя перадаплаты за тавары, якія не могуць прывезці. Акрамя таго, блакіроўка рахункаў азначае, што нават калі тавар быў прададзены і дастаўлены, грошы былі замарожаныя. Кожная галіна, якая гандлявала з Беларуссю і Расіяй, будзе паралізаваная, а ў нашай галіне гэта поўны параліч», — тлумачыць прэзідэнт мытнага агенцтва DTA Яраслаў Мысткоўскі. Прадпрымальнікі дасведчаны аб міжнароднай сітуацыі і чулі аргументы еўрапейскіх улад, якія прынялі рашэнне ўвесці санкцыі. «Аднак санкцыі ўдарылі настолькі моцна, што без якой-небудзь дзяржаўнай дапамогі нам будзе складана выжыць. Калі нейкі час мы будзем у мінусе, выхаду няма — давядзецца аб'явіць сябе банкрутамі», — прагназуе Яраслаў Мысткоўскі.

Санкцыі таксама зменяць рынак працы, шмат людзей застануцца без работы. Як адзначае Пётр Голдын, палякі будуць яе шукаць, не ставячы ніякіх умоў. «Пытанне толькі ў тым, хто зможа даць ім гэтую работу? І зноў жа яе будуць прапаноўваць канцэрны, а не дробныя агенцтвы. Так што малое прадпрымальніцтва мы дакладна заб'ём, а яно мае вельмі вялікі працэнт на рынку працы», — кажа Пётр Голдын.

ЗАЛОЖНІКІ ГЕАПАЛІТЫКІ

Акрамя брокераў, санкцыі ўдараць па многіх польскіх транспартных кампаніях. «Польскія міжнародныя аўтаперавозчыкі заўсёды былі заложнікамі геапалітыкі», — падкрэслівае Ганна Бжэзінская-Рыбіцкая з Асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў (ZMPD) у Польшчы. Па ацэнках ZMPD, у выніку санкцый ЕС пацерпяць каля дзвюх тысяч польскіх транспартных кампаній, у штаце якіх працуюць 20 тысяч кіроўцаў. Калі дадаць сюды членаў сем'яў гэтых кіроўцаў, атрымліваецца, што ад заробку, звязанага з перавозкай грузаў на Усход, залежаць амаль 100 тысяч чалавек, зазначае Ганна Бжэзінская-Рыбіцкая.

ZMPD нагадвае: польскія перавозчыкі вазілі грузы не толькі ў Беларусь і Расію, але і рухаліся транзітам праз гэтыя дзве краіны, у тым ліку ў Манголію, Узбекістан і Казахстан. Праз абмежаванні на ўезд для перавозчыкаў з ЕС, уведзеных беларускімі ўладамі ў адказ на еўрапейскія санкцыі, польскія кампаніі сутыкнуліся з непрыемнымі наступствамі. «Закрыццё транзіту праз Беларусь і нявызначаная сітуацыя з магчымымі забаронамі на перавозкі ў Расію, з яе або праз яе тэрыторыю паставілі нашых перавозчыкаў, якія заключалі доўгатэрміновыя кантракты з прадпрыемствамі ў далёкай Азіі, у вельмі складанае становішча. Па сутнасці, у іх ёсць два варыянты: альбо плаціць сур'ёзныя кампенсацыі за сарваныя кантракты, альбо паспрабаваць аб'ехаць — праз Турцыю і Іран, — што, вядома, звязана са значна большым часам на перавозку і значна больш высокімі транспартнымі выдаткамі», — тлумачыць прадстаўнік ZMPD.

Па словах перавозчыкаў, у кароткатэрміновай перспектыве ланцужок паставак можа быць парушаны, а ў доўгатэрміновай польскія кампаніі будуць заменены транспартнымі кампаніямі з-за мяжы ЕС. «Мы ўжо назіраем усплёск цікавасці да ўсходняга напрамку з боку сербаў і туркаў. Для прадстаўнікоў гэтых краін вымушаная адмова польскіх кампаній ад перавозак у гэтым напрамку падобная на выйгрыш у латарэю», — лічыць Ганна Бжэзінская-Рыбіцкая.

«ГЭТА КАНЕЦ»

Журналісты Onet.pl пагутарылі з кіраўнікамі польскіх транспартных кампаній, якія пацярпелі ад санкцый ЕС і мер Беларусі ў адказ. У кампаніі Artex Transport распавялі аб планаваных скарачэннях штата. «Магчыма, я буду вымушаны не толькі звольніць людзей, але і закрыць усю кампанію. Каля 80 працэнтаў нашых грузаперавозак ішлі на Усход. Астатнія — на Захад. Вы самі бачыце, што гэта канец для нас», — кажа кіраўнік кампаніі Артур Камінскі. На пытанне журналіста, ці не звярталася прадпрыемства да ўрада па дапамогу, Артур Камінскі заявіў, што ў Польшчы няма з кім размаўляць. «Вы смееце ся? Якая дапамога ад дзяржавы? З кім нам пагаварыць? Міністр інфраструктуры Анджэй Адамчык толькі называе сябе міністрам інфраструктуры. Праз чатыры хвіліны ён сыходзіць са сходу, застаецца толькі яго намеснік і лье нам ваду. Тут нічога не мяняецца гадамі», — кажа ён.

З аналагічнымі праблемамі сутыкнуўся і кіраўнік кампаніі Anika-Trans Кшыштаф Стшала. «Палова нашых грузавікоў перавозіла тавары з заходніх рынкаў ва ўсходнія краіны. На дадзены момант мы губляем рынкі. Мы, безумоўна, панясём вялізныя страты. Цяпер дзевяць нашых аўтамабіляў знаходзяцца за межамі Польшчы, у тым ліку ў Казахстане. Я не ведаю, ці змогуць яны наогул вярнуцца ў Польшчу», — кажа Кшыштаф Стшала. Прадпрымальнік не ведае, як рэалізаваць свае кантракты. «Турцыя і Каспійскае мора — вельмі непрадказальныя маршруты. Гэта таксама вялікія выдаткі і лішні час. Мы адмовіліся ад гэтай ідэі раней», — дадае Кшыштаф Стшала. Для польскіх прадпрымальнікаў з транспартнай сферы падзеі ва Украіне сталі свайго роду кульмінацыяй нарастаючых праблем у галіне. На працягу многіх гадоў міжнародныя аўтамабільныя перавозкі развіваліся без дапамогі дзяржавы, пры гэтым прыносячы значныя даходы ў дзяржбюджэт.

«Варта даць зразумець усім, што ў польскіх транспартных кампаній з офісамі ва ўсходняй частцы Польшчы ёсць выбар: яны альбо едуць на Усход, альбо не едуць і аб'яўляюць сябе банкрутамі. Нямногія паедуць на Захад, хаця б з-за «пакета мабільнасці» (які абавязвае дальнабойшчыкаў кожны месяц вяртацца на адпачынак па месцы прапіскі. — **Заўв. БелТА**) і значна больш высокіх, асабліва сёння, затрат на паліва, не кажучы ўжо аб радыкальна ўзрослай канкурэнцыі ў апошнія месяцы.Так ці інакш, змяненні ў палажэннях «пакета мабільнасці» зрабілі польскіх перавозчыкаў занадта дарагімі для заходніх партнёраў на дадзены момант. І гэта выкліча скарачэнне нашай прапановы і, як вынік, вымушаны сыход з гэтага рынку», — прагназуе Ганна Бжэзінская-Рыбіцкая.

У перавозчыкаў, якія заўсёды ездзілі толькі ва ўсходнім напрамку, няма ніякага плана Б. Яны не былі гатовы да сітуацыі, што ўзнікла два месяцы таму. «Польскія міжнародныя аўтамабільныя перавозкі на Усход паміраюць», — падкрэслівае Ганна Бжэзінская-Рыбіцкая. Асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў раней звярталася да ўрада Польшчы з просьбай кампенсаваць страты транспартных кампаній. Перамовы па гэтым пытанні працягваюцца. Аднак польскім перавозчыкам дапамога патрэбная зараз, заключае Onet.pl, таму што ў найбліжэйшай будучыні — пасля банкруцтваў кампаній — яна ўжо будзе нікому не патрэбная.

КАТАСТРАФІЧНЫ СЦЭНАРЫЙ

Безадказная палітыка польскага ўрада прывядзе да катастрафічнай інфляцыі ў краіне. Пра гэта заявіў польскі эканаміст, колішні прэм'ер-міністр Польшчы Марэк Белька, паведаміў Onet.pl. Экспрэм'ер лічыць, што краіна рушыць па сцэнарыі «эканамічнай катастрофы». На думку эксперта, на рост цэн паўплывала ў тым ліку запозненая рэакцыя польскага Нацбанка. «Інфляцыя, якую мы вымералі ў сакавіку, з'яўляецца вынікам росту цэн на імпартныя тавары і бесклапотнай эканамічнай палітыкі ў апошнія гады. З аднаго боку, у нас была запозненая рэакцыя на інфляцыю з боку Нацбанка, а з другога — пастаяннае павелічэнне расходаў дзяржбюджэту. Такія асноўныя прычыны інфляцыі», — сказаў Марэк Белька. Ён папярэджвае, што цэны будуць яшчэ вышэйшыя. «Мы ўжо ўступілі ў пандэмію з інфляцыяй, вышэйшай за запланаваную», — сказаў Марэк Белька.

Раней паведамлялася, што Польшча ўступіла ў этап галапуючай інфляцыі. У сакавіку яна складала 10,9 працэнта. У апошні раз двухзначны рост цэн адбыўся ў Польшчы ў 2000-м. Пры гэтым Нацбанк папярэдзіў, што высокая інфляцыя захаваецца як мінімум да 2024 года.

У мінулым месяцы ў Польшчы зноў значна падаражэлі прадукты харчавання і бытавая хімія. Пра гэта сведчыць аналіз рознічных цэн, праведзены ў сакавіку кампаніямі UCE Research, Hiper-Com Poland і WSB Universities, паведаміў польскі інфармацыйны партал радыё RMF 24. У час даследавання былі прааналізаваны цэны на 12 катэгорый тавараў, уключаючы прадукты харчавання, харчовыя дабаўкі, напоі і бытавую хімію. Аказалася, што цэны на ўсе 12 катэгорый тавараў паказалі рост. Аналіз сведчыць, што ў Польшчы зафіксаваны найбольшы рост цэн на маслатлушчавую прадукцыю. Так, у сакавіку ў гадавым вылічэнні маргарын падаражэў на 41,6 працэнта, алей — на 29,2 працэнта. Цэны на муку за год выраслі на 28 працэнтаў, цукар падаражэў на 10,1. Цана на мяса за год выраслa ў сярэднім на 22,1 працэнта. Найбольшы скачок зафіксаваны на ялавічыну — 30,2 працэнта, мяса птушкі падаражэла на 15,2, свініна — на 12 працэнтаў. Малочныя прадукты падаражэлі ў сярэднім на 10 працэнтаў. Больш за ўсё цэны ўзняліся на сыр — 25,7 працэнта. Цэны на агародніну ў сярэднім выраслі на 20,5 працэнта, на садавіну — 12,3 працэнта. Зразумела, усё гэта моцна ўдарыла па дабрабыце палякаў. Агульная сітуацыя ўскладняецца тым, што «Газпрам» прыпыніў пастаўкі газу ў Польшчу з-за яе адмовы разлічвацца расійскімі рублямі.

Тым часам стала вядома, што міністр нацыянальнай абароны Польшчы Марыюш Блашчак падпісаў з амерыканскім бокам дагавор на пастаўку рэспублікі 250 танкаў Abrams, паведаміла ТАСС. Агульны кошт гэтай тэхнікі складае каля 20 мільярдаў злотых (больш за 4,2 мільярда еўра), што з'яўляецца найбуйнейшым кантрактам на закупку ўзбраення для польскага войска. 250 машын хопіць для аснашчэння чатырох танкавых батальёнаў. Яны паступяць у новую, 18-ю дывізію на ўсходзе краіны. Пагадзіцеся, на фоне эканамічнай катастрофы рэкордныя вайсковыя выдаткі выглядаюць проста вар'яцкімі.

Зрэшты, такія дзеянні варта ўспрымаць у пэўным кантэксце. Польшча разглядаецца ЗША перш за ўсё як плацдарм для наступлення НАТА на Расію. Пра гэта ў эфіры «Альфа-радыё» заявіў палітолаг Вадзім Баравік. «Калі Польшча думае, што ёй падрыхтавана роля квітнеючай усходнееўрапейскай краіны, якая будзе паспяхова канкураваць з Германіяй, яна памыляецца, — адзначыў палітолаг. — Прыбалтыйскім рэспублікам, якія просяць, чакаюць новыя дывізіі і напампоўваюцца ўзбраеннямі, і Польшчы амерыканцамі падрыхтавана роля зоны, адкуль будзе пачынацца вострая фаза ваеннай аперацыі з боку НАТА». Такі вось расклад. І дабрабыт простых палякаў у такой «схеме» пытанне з разраду другарадных.

Пётр ДУНЬКО.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) с дополнением от 10.08.2021 № 151 (29520), от 02.10.2021 № 190 (29559), от 27.10.2021 № 207 (29576), от 13.11.2021 № 220 (29589), от 10.12.2021 г. № 239 (29608), от 29.12.2021 № 251 (29620), от 15.01.2022 № 9 (29631), от 04.02.2022 № 23 (29645), от 19.03.2022 № 54 (29676)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Местонахождение: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517), следующие изменения:

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – апрель 2019 года;
окончание строительства – ноябрь 2022 года.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 01.11.2022 года.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392 20 45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте gastello.by.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 11.09.2021 № 175 (29544), от 02.10.2021 № 190 (29559); от 10.12.2021 № 239 (29608), от 26.02.2022 № 39 (29661)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства машино-мест в гараж-стоянке, расположенной в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364), следующие изменения:

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – апрель 2019 года;
окончание строительства – ноябрь 2022 года.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 01.11.2022 года.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392 20 45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте gastello.by.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460), следующие изменения:

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – апрель 2019 года;
окончание строительства – ноябрь 2022 года.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 01.11.2022 года.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392 20 45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте gastello.by.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 11.09.2021 № 175 (29544)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства нежилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 11.09.2021 № 175 (29544), следующие изменения:

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – апрель 2019 года;
окончание строительства – ноябрь 2022 года.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 01.11.2022 года.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392 20 45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте gastello.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению РУП «Шипяны-АСК» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот № 1: легковой автомобиль «TOYOTA RAV 4», 2007 года выпуска, тип кузова – хэтчбек, цвет – серебристый, механическая коробка передач, тип двигателя – бензиновый, объём – 1998 см. куб., мощность – 152 л.с., полная масса – 2070 кг, колесная формула – 4х4, идентификационный № JTMBH31V006057356, регистрационный знак 3322 EI-5, страна происхождения – Япония.

Начальная цена с НДС (20 %) – **15 480,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 548,00** бел. руб.

